МОСКВА 19
УЛ. МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14
ВСЕСОЮЗНОЙ БИБЛИОТЕКЕ
ИМ. СЕРПИНА
ВСЕСОЮЗНАЯ БИБЛИОТЕКА ИМЕНИ В. И. ЛЕНИНА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 34 (5708) | 11 лютага 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Прыём міністра замежных спраў Фінляндыі старшынёй СНК Саюза ССР тав. В. М. Молатавым.

Паведамленне аб гутарках тав. М. М. Літвінава з міністрам замежных спраў Фінляндыі п. Р. Холсці.

Ушанаванне памяці найвялікшага рускага паэта — Мітынг ля помніка А. С. Пушкіну ў Маскве.

Пагранічнікі ў тав. Н. І. Ежова.

Аб невыкананні плана механізацыі лесаперавозак трэстам Лесбел — Пастанова Упаўнаважанага Камісіі Совецкага Кантроля пры СНК СССР па Беларускай ССР.

Знатныя людзі на прыёме ў кіраўнікоў партыі і ўрада БССР.

Перадавы артыкул: Перад Надзвычайным XII З'ездам Советаў БССР.

Вышэй узровень партыйнай работы.

К. Ф. Бенек — Па-большэвіцку рыхтавацца да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

А. Б. Рыськін — Аб партыйных сходах.

За граніцай: Пушкінскія дні за рубяжом. Вакол каланіяльных патрабаванняў Германіі. Становішча на мадрыдскім фронце. Разгул фашысцкага тэрору ў гор. Малага. Водгукі на прабыванне фінляндскага міністра замежных спраў у Маскве.

ПЕРАД НАДЗВЫЧАЙНЫМ XII З'ЕЗДАМ СОВЕТАЎ БССР

Радасныя дні перажывае беларускі народ. На аснове заперджанай Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездам Советаў сталінскай Канстытуцыі выпрацаван і апублікаван праект Канстытуцыі БССР — новы закон шчаслівага жыцця беларускага народу. З усіх канцоў рэспублікі — фабрык і заводаў, соўгасаў і калгасаў — нясецца кліч поўнага адабрэння гістарычнага дакумента беларускага народу.

Адвеку беларускі народ быў падняволным. Польскія паны і літоўскія князі, рускія прыгоннікі і фабрыканты, свая ласная буржуазія рвалі на часткі жывое цела народу беларускага. Адны эксплаататары змянялі другіх, а жабрацтва, горсткая эксплаататарыя прапоўных астаёліся. У моры народнай крыві затапляла ся ўсякая спроба беларускага народу вызваліцца ад сацыяльнага і нацыянальнага гнёту.

Ніколі за ўсе гады свайго існавання беларускі народ не меў сваёй дзяржаўнасці, і толькі вялікая сацыялістычная пастрычніцкая рэволюцыя, разбіўшая ланцугі рабства, бяспраўя, эксплаатацыі, паставіла беларускі народ роўным сярод роўных у вялікім сузор'і народнасцей СССР.

Толькі пад кіраўніцтвам гераічнай партыі Леніна — Сталіна, па ініцыятыве правадыра народаў таварыша Сталіна, пры дапамозе вялікай сям'і народаў СССР рускага пролетарыята ў першую чаргу ператварыўся беларускі народ. Пяўхільнае жыццяўленне мудрай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі ператварыла Беларусь — былую калонію царскага самаўладства — у квітнеючую індустрыяльна - калгасную ордэнаносную рэспубліку.

Поллыя агенты сусветнай буржуазіі — меншавікі, эсэры, бундаўцы, контрэволюцыйныя беларускія нацдэмы, праклятыя фашысцкія сабакі — трацкісты рыкладалі ўсе сілы да таго, каб аддаць зладую Совецкую Беларусь на разарванне польскіх і нямецкіх фашыстаў.

Шкодніцтвам, шпіянажам, дыверсіяй тэрорам хацелі лютыя вораги народу аддаць у рабочых і калгаснікаў вялікія заваёўванні, зноў ускласці на іх шыю ярмо капіталістычнай эксплаатацыі і кулацкай абалы.

З пранэса над контрэволюцыйным рацкісцкім паралельным цэнтрам працоўныя зрабілі для сябе вывад: вышэй рэволюцыйную пільнасць! Ніякай літасці ворагам соцыялістычнага будаўніцтва.

I, вывучаючы праект Канстытуцыі, беларускі народ памятае сваё прыгонічнае становішча і ў сувязі з гэтым сваю адказнасць перад вялікім Совецкім Саюзам.

— Мы пільна будзем ахоўваць разам з Чырвонай Арміяй нашы граніцы, ні адзін вораг не пяройдзе на нашу тэрыторыю, — заяўляюць у сваіх рэзалюцыях калгаснікі пагранічных калгасаў.

Стаханаўскай работай, новымі вытворчымі рэкордамі рабочыя і калгаснікі ліквідуюць рэшткі ворага. Бяжлітасна выкрываюцца вораги народу, прабуючыя перашкодзіць паспяховаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Праз некалькі дзён у сталіцу БССР з'едуцца выбраннікі народу — дэлегаты Надзвычайнага XII З'езда Советаў. Яны зацвердзяць Канстытуцыю Беларускай Рэспублікі. У гісторыю беларускага народу гэты дзень увойдзе, як адна з самых слаўных, радасных яе старонак.

Гэтаму З'езду працоўныя рыхтуюць добрую сустрэчу. З кожным днём множыцца лік стаханаўцаў, якія паказваюць узоры высокапрадукцыйнай працы.

— Мы абавязваемся зацверджаны нам урадам план на 1937 год выканаць датэрмінова да XX галавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі, — заяўляюць у сваёй рэзалюцыі рабочыя пагельнага завода № 3 (Менск).

Рабочыя завода «Большэвік» абавязаліся перавыканаць план за 15 дзён лютага не менш чым на 5 проц. па хрому і на 15 проц. — па адыходнаму клею. Гэта сваё абавязацельства яны з гонарам выканаюць.

Калгаснікі калгаса імя Кірава Чавускага раёна абавязаліся да адкрыцця З'езда завяршыць падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Увесь беларускі народ напоўнен адным жаданнем — працаваць яшчэ лепш на карысць сваёй радзімы. Кожны хоча ўнесці свой падарунак у агульнанародны фонд. Шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да гістарычнага Надзвычайнага XII З'езда Советаў БССР. Арганізуем работу так, каб у нас не было прадпрыемстваў, што не выконваюць план, рабочых, якія не выконваюць новых норм выпрацоўкі, ні аднаго соўгаса і калгаса, непадрыхтаванага да сяўбы.

ВЫШЭЙ УЗРОВЕНЬ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

Сёння мы публікуем пастанову пленума Менскага гаркома па важнейшаму пытанню партыйнага жыцця — аб партыйных сходах.

ЦК ВКП(б), партыйныя з'езды і канферэнцыі ў сваіх пастановах неаднаразова ўказвалі на велізарную ролю партыйнага схода ў справе выхавання комуністаў. Партыйныя сходы з'яўляюцца баявой школай большэвіцкага выхавання комуністаў. На жаль, у радзе партыйных арганізацый Беларусі партыйныя сходы шчэ не ўзняты на такую вышыню, якая адпавядае ім у партыйным жыцці.

ЦК ВКП(б) у сваіх пастановах указаў на буйнейшы недахоп пастаноўкі партыйнай работы ў Азова-Чорнаморскай і Кіеўскай партыйных арганізацыях. Трэба праўда сказаць, што дзяцькае захапленне гаспадарчымі пытаннямі, падмена гаспадарчага і совецкага кіраўніцтва, зрыў дзіначалля — гэтыя небольшэвіцкія метады работы ёсць у радзе райкомаў і першых партыйных арганізацыях Беларусі. Усе гэтыя недахопы знаходзяць сваё адлюстраванне ў арганізацыі і змесце партыйных сходаў.

Вось, напрыклад, першая партыйная арганізацыя Барысаўскага райвыканкома. Яна палічыла патрэбным абмеркаваць на партыйным сходзе пытанне аб звальненні рыбіральшчыцы. Ясна, што такія пытанні не садзейнічаюць павышэнню ідэйнага зроўню комуніста, а зніжаюць яго, не садзейнічаюць павышэнню пільнасці комуністаў, а прытупляюць яе.

Партарганізацыя Барысаўскага горсовета замест таго, каб абмяркоўваць і расследоўваць партыйныя пытанні, захапляецца пытаннямі гаспадаркі, прысвойваючы сабе функцыі горсовета. Так, напрыклад, яна абмеркавала пытанне аб абоце «Зялёнгаса» і прыняла рашэнне вызваліць Прыміна (загадчыка трэста) ад работы, назначыўшы туды Светнікава. Гэта пастанова з усёй відавочнасцю паказвае, што першая партыйная арганізацыя гарадскога совета не толькі не разумее ролі партыйнага схода, але і яўна парушае прынцыпы совецкай работы. Райком прайшоў міма гэтага рашэння, паказаўшы ым самым, што падмена совецкіх органаў не чужа і яму.

Пленум гаркома выкрыў падобныя недахопы ў правядзенні сходаў у першых партыйных арганізацыях Менска, расрытыкаваў іх і прыняў рашэнне, якое абяспечвае карэнны паварот у ператварэнні партыйных сходаў у сапраўдныя баявыя школы большэвіцкага выхавання комуністаў.

Статут партыі — закон арганізацыі партыйнага жыцця. Правядзенне статута абавязкова. Сакратары, як кіраўнікі партыйных арганізацый, перш за ўсё павінны адказваць за поўнае правядзенне ў жыццё статута партыі. Практыка, аднак, паказвае, што ва многіх арганізацыях Менска статут партыі парушаўся. Менскі гарадскі камітэт партыі справядліва звярнуў асаблівую ўвагу першых партыйных арганізацый на недапушчальнасць каантыцы і стварэнне партгруп у арганізацыях, якія маюць менш 100 комуністаў. Стварэнне такіх партгруп прывяло, як паказала практыка, да таго, што партыйны камітэт і яго сакратар адрываліся ад комуністаў. Гэта практыка асуджана пленумам Менскага гаркома. Але яна мае месца не толькі ў Менскай гарадской партыйнай арганізацыі. У Гомелі, Віцебску, Магілеве, Оршы і ў інш. месцах можна знайсці падобныя факты парушэння статута партыі. Неабходна гэтыя парушэнні ліквідаваць. Партыйны статут — аснова партыйнага жыцця, закон арганізацыйнай пабудовы партыі і парушаць яго нікому не дазволена. Толькі людзі, якія нічога не разумеюць у партыйным жыцці, не бачаць таго, што парушэнне статута партыі прыводзіць звычайна да паслаблення рэволюцыйнай пільнасці, да разбурэння комуністаў у барацьбе супроць класавага ворага.

Кожны член нашай вялікай партыі, кожны комуніст адказны за тое, што адбываецца ў арганізацыі. Між тым, як паказалі факты з жыцця Менскай партыйнай арганізацыі, такой адказнасці не адчуваецца нават у некаторых членаў партыйных камітэтаў. Над павышэннем партыйнай адказнасці членаў парткома, як і кожнага комуніста, сакратары партыйных арганізацый павінны ўсямерна працаваць.

Пастанова Менскага гарадскога камітэта партыі выкрывае многа недахопаў пастаноўкі партыйнай работы ў пярвічных арганізацыях і намячае меры рашучага перамагання гэтых недахопаў. Мы горача рэкамендуем усім райкомам і пярвічным партыйным арганізацыям вывучыць рэзалюцыю Менскага гарадскога камітэта аб партыйных сходах, вывучыць становішча справы ў сябе, рашуча выкрыць усе недахопы партыйнай работы, усямерна павышаць самакрытыку ў арганізацыі, павышаць пільнасць комуністаў, узбройваць іх для барацьбы з трацкістамі, правымі, нацдэмамі і інш. ворагамі совецкай улады і партыі.

ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ НА ПРЫЁМЕ У КІРАЎНІКОЎ ПАРТЫІ І ЎРАДА БССР

110 трактарыстаў, камбайнераў, механікаў ільноцерабільшчыкаў 10 лютага былі прыняты кіраўнікамі партыі і ўрада ордэнаноснай БССР.

На прыёме прысутнічалі: сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Валковіч**, старшыня ЦВК тав. **Чарвякоў**, намеснік старшыні Совнаркома БССР тав. **Любовіч**, загадчык сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б тав. **Картуноў** і народны камісар земляробства БССР тав. **Бенек**.

На нарадзе прысутнічаў ордэнаносец Свірыд, малацільшчык Хойніцкай МТС, брыгадзір Копыльскай МТС член ЦВК БССР і СССР Зоня Рачок.

Лепшыя людзі ордэнаноснай БССР сабраліся, каб падзяліцца вопытам работы і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы ў барацьбе за высокі ўраджай.

Камбайнер Старобінскай МТС Лойка Фёдар у сваім выступленні расказаў кіраўнікам партыі і ўрада аб сваёй рабоце.

«Я на камбайне, — гаворыць Лойка, — працаваў першы год. Калі выязджаў на поле, то ворагі гаварылі, што гэтая машына на нашых палях не пойдзе. А я прымусіў камбайн працаваць так, як гэта трэба. Замест 80 гектараў па плану я ўбраў 256. У гэтым годзе абавязваюся ўбраць камбайнам 300 гектараў. Каб поўнасцю скарыстаць трактар, я абавязваюся апрача таго, што буду працаваць на камбайне, узараць яшчэ за сезон 1.200 гектараў».

Дэлегат Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў і Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Советаў Чубакоў Раман з Хоцімскай МТС расказаў, як ён у 1936 годзе выпрацаваў на трактары «ХТЗ» 1.506 гектараў.

— Зараз, — гаворыць тав. Чубакоў, — я вучуся на курсах па вывучэнню трактара «ЧТЗ» і абавязваюся ўзараць у гэтым годзе 3.000 гектараў, на што і выклікаю ўсіх трактарыстаў.

З прамовамі выступілі старшыня ЦВК БССР тав. **Чарвякоў**, загадчык сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б тав. **Картуноў**. Тав. Чарвякоў даў трактарыстам, ільноцерабільшчыкам і машыністам рад практычных указанняў у барацьбе за павышэнне ўраджайнасці, за хутчэйшае выкананне лозунга правадыра народаў таварыша **Сталіна** аб штогодняй вытворчасці 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

АБ НЕВЫКАНАННІ ПЛАНА МЕХАНІЗАЦЫІ ЛЕСАПЕРАВОЗАК ТРЭСТАМ ЛЕСБЕЛ

ПАСТАНОВА № 4 УПАЎНАВАЖАНАГА КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ ПРЫ СНК СССР ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

8 лютага 1937 г. **г. Менск.**

Кіраўнік трэста Лесбел т. Рэсін не прыняў неабходных мер да арганізацыі работы леспрамгасаў у справе выкарыстання механізмаў, не забяспечыў капітальны рамонт трактараў і аўтамашын, у рэзультаце чаго квартальны план механізаванай лесавывазкі на 1 лютага выканан па Лесбелу ў цэлым па трактарах і аўтамашынах усяго толькі на 12 проц.

Дырэктар Рэчыцкага леспрамгаса т. Сіманоўкер А. Л., намеснік начальніка і тэхнарук Бабічскага механізаванага пункта т. Апановіч А. М. не забяспечылі якасці рамонту і правільнага выкарыстання трактароў, не арганізавалі стаханаўскага руху. Сістэма зарплаты рамонтным рабочым не была ўвязана з якасцю рамонту і скарачэннем прастояў машын. Працуючыя трактары не забяспечваліся палтралёванай драўнінай і прастойвалі пад нагрузкай.

Механік Калеснікаў злачынна трымаў трактары ў бесперапынным рамонце (з 10 трактараў прапавала ўсяго 2—3); прастоі трактараў у рамонце складалі 57 проц. рабочага часу.

У рэзультаце квартальны план на 1 лютага г. г. па Рэчыцкаму леспрамгасу выкананы па трактарах усяго на 11,7 проц., а па аўтамашынах — на 15 проц.

1. Дырэктару Лесбела т. Рэсіну І. Г. за незабеспячэнне выканання плана па лесамеханізаванай вывазцы абвясціць вымову.

2. Дырэктару Рэчыцкага леспрамгаса т. Сіманоўкеру А. Л. за бяздзейнасць у наладжванні работы механізмаў, за невыкананне плана абвясціць суровую вымову.

3. За адсутнасць арганізацыі рамонту трактараў, за дапушчэнне прастояў трактараў намесніку начальніка Бабічскага механізаванага пункта т. Апановічу А. М. абвясціць суровую вымову з папярэджаннем.

4. Звярнуць увагу Наркамлеса БССР т. Рудакова І. Г. на зусім недапушчальна дрэнную арганізацыю справы лесамеханізаванай вывазкі з боку Лесбела.

Прапанаваць т. Рудакову І. Г. абавязаць Лесбел і леспрамгасы прыняць неабходныя меры да адхілення прычын дрэннай работы механізмаў, забяспечыць поўнае выкарыстанне механізмаў, паладзіць якасны рамонту іх, арганізаваць падрыхтоўку кадраў і забяспечыць выкананне плана лесавывазкі.

Аб прынятых мерах паведаміць да 23 лютага г. г.

Упаўнаважаны КСК пры СНК СССР па БССР А. ЦІХОН.

ПРЫЁМ МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ФІНЛЯНДЫІ СТАРШЫНЁЙ СНК САЮЗА ССР тав. В. М. МОЛАТАВЫМ

9 лютага г. г. міністр замежных спраў Фінляндыі п. Холсці быў прынят старшынёй Совета Народных Камісараў Саюза ССР тав. В. М. Молатавым.

На прыёме прысутнічалі: надзвычайны пасланнік і паўнамочны міністр Фінляндыі ў СССР п. барон Ір'е-Каскінен, намеснік народнага камісара замежных спраў тав. Н. Н. Крэсцінскі і паўпрэд СССР у Фінляндыі тав. Э. А. Асмус.

Пасля гутаркі тав. В. М. Молатаў даў у гонар п. Холсці снеданне.

На снеданні, апрача памянёных асоб, прысутнічалі таварышы: К. Е. Варашылаў, Л. М. Каганові́ч, В. Я. Чубар, А. І. Мікаян, В. І. Межлаук, А. П. Розенгольц, А. С. Бубноў, Б. С. Стаманякаў, дырэктар палітычнага дэпартамента фінляндскага міністэрства замежных спраў п. Паюла, тт. М. А. Карскі, А. М. Магільны, В. М. Баркоў і Я. С. Ільінскі.

У часе снедання тав. В. М. Молатаў і п. Холсці абмяняліся прывітальнымі прамовамі.

(БЕЛТА).

ПРЫЁМ У ПАСЛАННІКА ФІНЛЯНДЫІ У ГОНАР МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ФІНЛЯНДЫІ

9 лютага з прычыны прабывання ў Маскве міністра замежных спраў Фінляндыі п. Холсці надзвычайны пасланнік і паўнамочны міністр Фінляндыі ў СССР п. Ір'е-Каскінен даў у гонар міністра абед.

На абедзе прысутнічалі таварышы В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, А. І. Мікаян, В. І. Межлаук, А. П. Розенгольц, А. І. Егораў, Н. Н. Крэсцінскі, Б. С. Стаманякаў, паўпрэд СССР у Фінляндыі тав. Э. А. Асмус, дырэктар палітычнага дэпартамента міністэрства замежных спраў Фінляндыі п. Паюла, адказныя работнікі НКЗС і чыны фінляндскай місіі.

Пасля абеду адбыўся прыём, на якім прысутнічалі члены дыпламатычнага корпуса, асобы вышэйшага каманднага саставу РСЧА, кіраўнікі совецкіх устаноў, прадстаўнікі совецкай грамадскасці і прадстаўнікі замежнага друку.

(БЕЛТА).

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ГУТАРКАХ тав. ЛІТВІНАВА З МІНІСТРАМ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ФІНЛЯНДЫІ

Народны камісар замежных спраў тав. М. М. Літвінаў меў некалькі гутарак з прыехаўшым у Маскву міністрам замежных спраў Фінляндыі п. Р. Холсці. Гэтыя гутаркі далі магчымасць прыязнага шырокага абмену думак па пытаннях, датычных як совецка-фінляндскіх узаемаадносін, так і агульнага міжнароднага становішча.

У рэзультаце абмену думак субяседнікі прышлі к заключэнню, што ў рамках існуючых совецка-фінляндскіх пагадненняў ёсць магчымасць бесперабойна развіваць і ўмацоўваць прыязныя добрасуседскія адносіны паміж абодвума дзяржавамі і што да гэтага імкнуцца і будуць імкнуцца абодва ўрады.

Далей субяседнікі канстатавалі, што цяперашняе міжнароднае становішча патрабуе ад усіх міралюбівых дзяржаў асобых намаганняў да ўмацавання ўсеагульнага міру на аснове калектыўнай бяспекі і іншых прынцыпаў Лігі нацый і, што, ідучы ў гэтым напрамку, знешняя палітыка совецкага і фінляндскага ўрадаў стварае магчымасць карыснага супрацоўніцтва паміж імі.

(БЕЛТА).

За халатныя адносіны да захоўвання і вывазу мінеральных угнаенняў — да адказнасці

Вываз мінеральных угнаенняў са складаў кантор «Сельхозснабжения» пры чыгуначных станцыях у калгасы праходзіць зусім незадавальняюча.

Нарком земляробства СССР тав. М. А. Чэрноў указаў наркому земляробства БССР і начальнікам курскага, заходняга, горкаўскага і кіраўскага зямельных кіраўніцтваў на адсутнасць з іх боку належнага кіраўніцтва вывазам мінеральных угнаенняў.

Віноўныя ў дрэнным захоўванні ўгнаенняў, выдачы іх без ваці, несвоечасовым вывазе ў калгасы прынягнуты да адказнасці. На рад работнікаў накладзены спагнанні.

На прадпрыемствах і ўстановах г. Менска праходзіць масавае вывучэнне праекта Канстытуцыі БССР. НА ЗДЫМКУ: група дапрызыўнікаў Менскага вучэбнага пункта Асоавіяхіма за вывучэннем праекта Канстытуцыі БССР.

Фото Лупейка (БСФ).

УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ НАЙВЯЛІКШАГА РУСКАГА ПАЭТА

МІТЫНГ ЛЯ ПОМНІКА А. С. ПУШКІНУ Ў МАСКВЕ

Маляўніча афармлена плошча, якая носіць імя Пушкіна. На фасадзе былога Страснога манастыра ўзвышаецца велізарная фігура паэта, які чытае вершы. Фасады будынкаў, якія выходзяць на плошчу, упрыгожаны вялікімі партрэтамі Пушкіна.

Пасля поўдня 10 лютага тысячы людзей запоўнілі Пушкінскую плошчу. На мітынг, прысвечаны памяці найвялікшага рускага паэта, са сцягамі і плакатамі прышлі дэлегацыі прадпрыемстваў, устаноў і грамадскіх арганізацый сталіцы. Высока над галовамі — сотні партрэтаў А. С. Пушкіна.

На трыбуне каля помніка сабраліся тт. Бубноў, Філатаў, Кулькоў, Карытны, пісьменнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Ля падножжа помніка — група паломкаў вялікага паэта.

Старшыня Маскоўскага абласнога і гарадскога Пушкінскага камітэта — старшыня Мосаблвыканкома тав. Н. А. Філатаў кароткай прамовай адкрывае мітынг.

— Ніколі неўміручая пушкінская слава не была так велічна, як у нашу цудоўную сталінскую эпоху, — гаворыць тав. Філатаў.

— Царскі дэспатызм сцёр з гэтага помніка сапраўдныя словы вялікага паэта. Самадзяржаўны лад баяўся праўды пушкінскіх вершаў. Сёння мы з вамі сабраліся тут, каб гэту праўду аднавіць, замяніўшы скажоны надпіс на помніку сапраўднымі словамі Пушкіна.

З помніка знімаецца пакрывала, і перад вачыма сабраўшыхся ўзнікае тэкст сапраўдных пушкінскіх вершаў, высечаных да юбілею на гранітным п'едэстале Грыміць «Інтэрнацыянал».

Ад імя Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР выступае Вс. **Іваноў**. У сваёй прамове ён напамінае аб тым, у якіх надзвычай цяжкіх умовах нікалаеўская Расія прыходзілася змагацца Пушкіну за права служыць роднаму народу сваімі вершамі.

Ад імя рабочых і работніц маскоўскіх прадпрыемстваў выступае інжынер-стахановец завода імя Фрунзе, ордэнаносец тав. **Бутусаў**.

У заключэнне з усхваляванай прамовай выступае вучань 10 класа 114 школы Совецкага раёна А. **Дуброўскі**.

— Ёсць юнацтва, якое ніколі не старыцца. Ёсць слава, якое ніколі не памірае. Ёсць слава, якая расце з гадамі. Гэта юнацтва, гэта жыццё, гэта — слава Пушкіна, — гаворыць тав. Дуброўскі.

Магутныя гукі «Інтэрнацыянала» разносяцца над плошчай. Мітынг скончан. Пад гукі марша калонамі праходзяць працоўныя міма помніка, аддаючы славу любімаму народнаму паэту.

На мітынгу прысутнічала 25.000 чалавек.

ПАГРАНІЧНІКІ У тав. Н. І. ЕЖОВА

9 лютага народны камісар унутраных спраў Саюза ССР — генеральны камісар дзяржаўнай безапаснасці тав. Н. І. **Ежоў** прыняў удзельнікаў гранадыёзнага веларабегу ўздоўж граніц Совецкага Саюза дынамаўпаў-пагранічнікаў тт. Люмірскага, Шубіна, Радзевіча, Морэва і Тімафеева, каманзіраў і байцоў Камчацкага пагранатрада, узнагароджанага ордэнам Леніна, і пагранічнікаў Беларускай ССР, якія апраўляюцца ў Градэкоўскі пагранічны атрад імя Л. М. Кагановіча, — тт. Егорава і Васеніна.

На прыёме прысутнічалі таксама намеснікі наркома ўнутраных спраў Саюза ССР: камкор М. П. Фрыноўскі, камісар дзяржаўнай безапаснасці 1-га ранга Я. С. Агранаў, камісар дзяржаўнай безапаснасці 2-га ранга Л. Н. Бельскі, начальнікі аддзелаў і кіраўніцтваў Наркамата ўнутраных спраў.

У сяброўскай гутарцы камандор веларабегу тав. Люмірскі падрабязна расказаў аб маршруце і задачах пераходу, аб тым, як удзельнікі прабегу, перамагаючы завеі і буран, дождж і туман, абледзянелыя горныя перавалы, тайгу і бязводныя пяскі Кара-Кума, упарта выконвалі сваю задачу.

Начальнік штаба Камчацкага пагранатрада палкоўнік Шышкароў гаварыў аб баявой гатоўнасці насельніцтва далёкай ускраіны Саюза да абароны сваёй любімай радзімы.

У канцы гутаркі народны камісар унутраных спраў Саюза ССР — генеральны камісар дзяржаўнай безапаснасці тав. Н. І. **Ежоў** пажадаў адважным пагранічнікам далейшых поспехаў у іх рабоце і вучобе.

— Галоўнае маё пажаданне, — сказаў тав. **Ежоў**, — не зазнавацца, не спыняцца на дасягнутых поспехах. Большэвік павінен заўсёды ісці наперад. Таму больш патрабаванняў да сябе! Вучыцеся, будзьце прыкладам, а мы вам у гэтым дапаможам.

(БЕЛТА).

ФІЛЬМ „ДАКЛАД таварыша СТАЛІНА"

Галоўнае кіраўніцтва кінапрамысловасцю СССР вызначыла для БССР 12 экземпляраў новага гукавога мастацка-дакументальнага фільма «Даклад таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі СССР на Надзвычайным VIII З'ездзе Советаў».

Гэты выдатны фільм з'яўляецца гістарычным дакументам выключнай важнасці. З прадзельнай яснасцю кожны, хто яго прагледзіць, зноў пачуе прамову таварыша Сталіна, запечатлее абстаноўку гэтага вялікага дня. Многія, бясспрэчна, будуць глядзець фільм некалькі разоў для таго, каб яшчэ лепш запамятаць аблічча нашага вялікага правадыра і яго гістарычны даклад.

Першыя чатыры экземпляры фільма Беллазяржкіно атрымае да 15 лютага. Яны будуць дэманстравацца ў Менску адначасова ў двух кінатэатрах — «Чырвонай зорцы» і «Пролетарый», а таксама ў Гомелі і Віцебску. Астатнія экземпляры чакаюцца да 20 лютага і будуць накіраваны ў іншыя гарады БССР.

ПАРТКАНФЕРЭНЦЫЯ МОЗЫРСКАГА РАЁНА

МОЗЫР, 10 лютага. (Кар. «Звязды»). Сёння ў 18 гадзін адкрылася партыйная канферэнцыя Мозырскага раёна. На канферэнцыі прысутнічае 200 дэлегатаў.

Пасля выбараў кіруючых органаў і ганаровага прэзідыума ў складзе членаў палітбюро ЦК ВКП(б), таварыша Сталіна і тт. Дзімітрава, Тэльмана, Хозе Дыяса, Ленскага, Валковіча і Галадзела, канферэнцыя прыступіла да дзелавой работы.

Першае сваё слова канферэнцыя накіравала правадыру партыі і працоўных таварышу Сталіну.

Са справаздачным дакладам аб рабоце раённага камітэта КП(б)Б выступіў сакратар РК тав. Левін. Канферэнцыя таксама заслухала справаздачу рэвізійнай камісіі.

11 лютага пачынаюцца спрэчкі па заслуханых дакладах.

ФРАЛОЎ.

ПУШКІНСКІЯ ДНІ ЗА РУБЯЖОМ

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 9 лютага. (БЕЛТА). Большасць чэхаславацкіх газет прысвячае цалкам свае нядзельныя далаткі і літаратурныя аддзелы стогадоваму юбілею А. С. Пушкіна. Газеты змяшчаюць вялікую колькасць артыкулаў і ілюстрацый, якія адносяцца да жыцця і творчасці вялікага рускага паэта. Пры гэтым падкрэсліваецца значэнне творчасці Пушкіна для сусветнай літаратуры, у тым ліку і для літаратуры Чэхаславакіі. Газеты змяшчаюць таксама шматлікія вытрымкі з новых чэшскіх перакладаў твораў Пушкіна.

ІРАН

ТЭГЕРАН (сталіца Ірана), 9 лютага. (БЕЛТА). Учора паўпрэдствам СССР у Іране быў арганізован прыём па повалу стагоддзя са дня смерці Пушкіна. На прыёме прысутнічалі звыш 500 гасцей, у тым ліку члены ўрада, меджыліса (парламента), прадстаўнікі навуковых, літаратурных колаў і друку. Сіламі совецкай калоніі быў арганізован канцэрт, прысвечаны пушкінскім творам.

Перад канцэртам вядомы іранскі паэт — рэдактар літаратурнага журнала «Армаган» Вехід прачытаў свае пераклады пушкінскіх вершаў, а таксама свае вершы, прысвечаныя Пушкіну.

ВЕНГРЫЯ

ВЕНА (сталіца Аўстрыі), 9 лютага. (БЕЛТА). Венгерскія газеты публікуюць рад матэрыялаў, прысвечаных сотай гадавіне смерці А. С. Пушкіна.

Газеты «Пестэр лойд», «Пешці напло», «Уй мад'яршаг», «Аз эшт» і іншыя падкрэсліваюць значэнне Пушкіна для сусветнай культуры і пры гэтым указваюць, што забойцай Пушкіна быў царскі рэжым.

Паведамляючы праграму пушкінскіх дзён у СССР, найбольш уплывовая газета «Пестэр лойд» піша:

«Вялікая краіна рыхтуецца адзначыць сотую гадавіну смерці Пушкіна... Увесь пывілізаваны свет прымае актыўны ўдзел у азнаменаванні гэтай гістарычнай гадавіны.

ГАЛАНДЫЯ

АМСТЭРДАМ (буйнейшы цэнтр Галандыі), 8 лютага. (БЕЛТА). Газета «Альгемеен хандэльсблад» прысвяціла артыкул стагоддзю са дня смерці Пушкіна. Газета адзначае ўсю сілу творчасці вялікага рускага паэта і значэнне яго твораў для сусветнай літаратуры і культуры.

Прадстаўнікі амерыканскай інтэлігенцыі выкрываюць „камітэт абароны Троцкага"

ПЬЮ-ІОРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 9 лютага. (БЕЛТА). Відныя пісьменнікі і прадстаўнікі інтэлігенцыі апублікавалі заяву, якая выкрывае «амерыканскі камітэт абароны Троцкага». Аўтары заявы ўказваюць, што камітэт пад прыкрыццём выступленняў за прадастаўленне Троцкаму права прытулку фактычна вядзе ўзмоцненую антысавецкую прапаганду.

«Троцкі, — гаворыцца ў заяве, — спакойна пражывае ў Мексіцы. Аднак, камітэт у сваіх публікацыях яраспа нападае на совецкі ўрад. Прадстаўнікі камітэта заклікаюць да ўзброенага паўстання ў Совецкім Саюзе». Паводле слоў заявы, высунутае камітэтам патрабаванне «бесстароннягa расследвання працэса» прадстаўляе сабой «варожае палітычнае ўмяшанне ва ўнутраныя справы Совецкага Саюза».

Аўтары заявы заклікаюць ліберальных членаў камітэта адмежавацца ад трацкіскіх нападак на Совецкі Саюз.

Сярод падпісаўшых заяву: супрацоўнік газетнага траста Скрыпс-Говард, старшыня саюза журналістаў ЗША Хейвуд Браун, пісьменнік Тэодар Дрэйзер, рэдактары журнала «Нейшэн — Макс Лернер і Макс Уэл Спюэрт, рэдактар «Нью рыпаблік» Уільям Мэнголд, карэспандэнт «Нейшэн» Луі Фішэр, кіраўнік місіі Чырвонага крыжа ў Расіі ў часе Кастрычніцкай рэволюцыі Рэймонд Робінс і шмат іншых відных прафесароў, пісьменнікаў, эканамістаў, дзеячоў мастацтваў і т. д.

Вакол каланіяльных патрабаванняў Германіі

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 лютага. (БЕЛТА). У сувязі з маючай быць сустрэчай германскага пасла ў Лондане Рыбентропа з намеснікам міністра замежных спраў Ілэна лордам Галіфаксам Пертынакс у «Эко дэ Пары» (орган генштаба) указвае, што «Англія не атрымала ніякага мандата весці ў адносінах калоній парагаворы ад імя Францыі».

Як піша Жэнеўэва Табуі ў «Эвр» (орган радыкал-сацыялістаў) у Лондане лічаць, што ніякія сур'ёзныя перагаворы паміж Англіяй і Германіяй не пачнуцца раней, чым будзе дасягнута франка-англійскае пагадненне. У руках Францыі і Англіі мандат Лігі нацый на ранейшыя германскія калоніі. Германія перш за ўсё павінна звярнуцца ў Лігу нацый, паколькі па версальскаму дагавору іменна Ліга нацый перадала мандаты па германскія калоніі Англіі і Францыі.

«У Берліне, — гаворыць далей Табуі, — антымізм у каланіяльным пытанні, як відаць знік. Гэта не перашкаджае, аднак, немцам заяўляць, што Германія патрабуе не мандатаў, а поўнацэнных калоній. Пражываючыя ў Берліне іншаземцы адзначаюць, што ў апошнія дні ў сувязі з загадам ваеннага міністэрства ўсе былыя афіцэры і унтэрафіцэры германскіх каланіяльных войск, прыгодныя зараз да ваеннай службы, абавязаны зарэгістравацца ў адпаведных ваенных установах.

У Гамбургу і Брэмене для афіцэраў і унтэрафіцэраў створаны спецыяльныя курсы, на якіх вывучаецца каланіяльная праблема.

Ваенныя падрыхтаванні Германіі на чэхаславацкай граніцы

ВЕНА (сталіца Аўстрыі), 9 лютага. (БЕЛТА). Парыжскі карэспандэнт органа швейцарскай сацыял-дэмакратычнай партыі «Бернер тагвахт» адзначае вялікі непакой у кіруючых французскіх ваенных колах у сувязі з узмоцненымі ваеннымі падрыхтаваннямі Германіі каля чэхаславацкай граніцы. Паводле слоў газеты, размешчаныя ўдоўж граніц у Саксоніі і ў Сілезіі ваенізаваныя фашысцкія атрады цяпер падначалены камандаванню рэйхсвера (германскай арміі) і забяспечаны паливой артылерыяй.

Пабудаваныя нядаўна тры казармы ў мястэчку Боберталь (на рацэ Бобер, Ніжняя Сілезія) заняты войскамі. На буйнай вузлавой чыгуначнай станцыі Хіршберг (Сілезія) пабудаваны вялікія падземныя процітаветраныя ўмацаванні. Падобныя-ж падземныя ўмацаванні ўзводзяцца ва ўсіх важных стратэгічных пунктах удоўж чэхаславацкай граніцы.

ВОДГУКІ НА ПАЕЗДКУ ХОЛСЦІ У МАСКВУ

СТАКГОЛЬМ (сталіца Швецыі), 9 лютага. (БЕЛТА). Усе шведскія газеты публікуюць сёння падрабязныя вытрымкі з прамовы Літвінава на прыёме ў гонар міністра замежных спраў Фінляндыі Холсці. Усе газеты падкрэсліваюць у загалоўках сардэчны характар гэтага прыёму. Самая распаўсюджаная ў Швецыі газета «Стакгольмс тыднінген» дзе наступныя загалоўкі: «Літвінаў жадае шчыльнага кантакта з Фінляндыяй. Совецкі ўрад пастаянна імкнуўся да прыязных адносін. Прыязная атмасфера маскоўскага візіта Холсці». Кансерватыўная газета «Свенска дагладэт» у артыкуле, прысвечаным візіту Холсці, у прыватнасці, піша: «Гэта, несумненна, гістарычны момант, калі міністр замежных спраў самастойнай Фінляндыі ў першы раз наведвае Маскву».

Ліберальная газета «Упсала нюа тыднінг» піша, што скандынаўскія дзяржавы (Швецыя і Нарвегія) хочуць падтрымліваць карэктныя адносіны з Совецкім Саюзам. «Таму, — піша газета, — паездка Холсці прадпрынята без шкоды для агульнаскандынаўскай арыентацыі Фінляндыі знешняй палітыкі».

Дацкія газеты асабліва цікавяцца паездкай Холсці. Блізкая да міністра замежных спраў Мунка газета «Палітыкен» адзначае паездку Холсці як «палітычную падзею вялікага значэння, за якой ва ўсім свеце, і асабліва ў скандынаўскіх краінах, будуць сачыць з вялікай увагай».

Мартынес — паліткамісар батальёна ўрадавых войск імя Тэльмана на мадрыдскім фронце. (СФ).

Пандо — камісар-камандзір батальёна ўрадавых войск імя Тэльмана на мадрыдскім фронце. (СФ).

Ваенна-фашысцкі мяцеж у Іспаніі

СТАНОВІШЧА НА ФРАНТАХ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 лютага. (БЕЛТА). Згодна паведамлення мадрыдскага карэспандэнта агенцтва Гавас сёння раніцой у сувязі з наступіўшым добрым надвор'ем уралавыя знішчальныя самалёты зрабілі рад разводачных палётаў вакол сталіцы. Залітыя сонцам вуліцы Мадрыда вельмі ажыўлены. Наступленне мяцежнікаў на сталіцу не ўнесла ніякіх змен у жыццё горада. Усе ўстановы функцыянуюць нармальна.

Як паведамляе карэспандэнт, старшыня камітэта абароны Мадрыда генерал Міяха прыняў сёння журналістаў, прыбыўшых да яго даведацца адносна разгортвання ваенных аперацый. Генерал Міяха, указаўшы, што ноч прайшла спакойна, дадаў:

«Няма падстаў непакоіцца па повалу праўвання, якое мяцежнікам удалося ажыццявіць у напрамку валенсійскай дарогі, каля подступаў якой разгортваюцца баі. Паваг калі-б гэты шлях зносін быў перарэзан, «мы маем іншыя дарогі, якія злучаюць нас з Валенсіяй».

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 9 лютага. (БЕЛТА). Ва апублікаваным у Мадрыдзе ў поўдзень уралавым паведамленні гаворыцца, што 8 лютага ў рэзультаце раду атак на паўднёвых участках цэнтральнага фронта мяцежнікі праніклі ў Васіа Мадрыд (за 20 кілометраў на паўднёвы ўсход ад Мадрыда). Урадавыя войскі ноччу прадпрынялі контратаку і зноў аўладалі большасцю пазіцый.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 лютага. (БЕЛТА). Мадрыдскі карэспандэнт агенцтва Гавас паведамляе, што баі, якія разгарнуліся ў сектары Аранхуэса (за 47 кілометраў на поўдзень ад Мадрыда) былі вельмі жорсткімі. Мяцежнікі вялі іх па металах германскай арміі.

Германскі пасол у Бургосе (рэзідэнцыя так званага «ўрада» мяцежнікаў) генерал Фаупель асабіста кіраваў дзеяннямі мяцежнікаў у гэтым сектары. Жорсткія ўтакі мяцежнікаў не зламалі баявога духу распубліканскіх войск на мадрыдскім фронце. Мяцежнікам не ўдалося заняць ні аднаго з тых пунктаў, захват якіх мог-бы аказаць уплыў на абарону сталіцы.

Разгул фашыскага тэрору ў гор. Малага

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 10 лютага. (БЕЛТА). Орган компартыі «Юманітэ» паведамляе, што пасля заняцця Малагі фашысцкія бандыты прыступілі да зверскай расправы з грамадзянскім насельніцтвам, якое бяжыць з горада. Бежанцы падвяргаюцца бамбардыроўцы як з сухазем'я, так і з мора. У бамбардыроўцы з мора прымаюць удзел германскія судны. Адначасова самалёты мяцежнікаў скідаюць бомбы над калонамі жанчын і дзяцей, якія пакідаюць Малагу. Налічваюцца тысячы афяр. Дарога з Малагі ў Альмерыю пакрыта трупамі і заліта кроўю. Камендантам Малагі назначан італьянскі палкоўнік.

Рух салідарнасці з іспанскім народам у Германіі

ВЕНА (сталіца Аўстрыі), 9 лютага. (БЕЛТА). Швейцарская каталіцкая газета «Остшвейц» апублікавала паведамленне, у якім гаворыцца аб росце сярод германскіх рабочых руху салідарнасці з іспанскім народам і аб праследваннях за праяўленне гэтай салідарнасці. Так, згодна паведамлення газеты, нядаўна ў Мюнхене—Гладбаху было арыштавана 80 рабочых за арганізацыю і за ўдзел у грашовых зборах на карысць рэспубліканскай Іспаніі. Газета адзначае, што асабліва актыўна кампанія салідарнасці развіваецца ў Саарскай вобласці.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РЫХТАВАЦЦА ДА УСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ

К. Ф. БЕНЕК

Старшыня выстаўкома, нарком земляробства БССР.

Да адкрыцця ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі засталося ўсяго 5½ месяцаў. Аднак у радзе раёнаў падрыхтоўка праводзіцца зусім нездавальняюча, што сведчыць аб недаацэнцы з боку раённага партыйнага і совецкага кіраўніцтва вялікага палітычнага і народнагаспадарчага значэння выстаўкі. Камарынскі раён, які павінен быў прадставіць экспанаты па капаплі, да гэтага часу не прадставіў у Выстаўком БССР аграпашпартоў, актаў аб адборы экспанатаў і характарыстыкі калгасаў. Такое-ж становішча ў Ельскім, Дрыбінскім і іншых раёнах. Гэта абавязвае рэспубліканскі і раённыя выставачныя камітэты актывізаваць сваю работу, апіраючыся на перадавыя калгасы і соўгасы, на стаханаўцаў нашай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Падрыхтоўка калгасаў, МТС і соўгасаў да ўсесаюзнай выстаўкі павінна стаць у цэнтры ўвагі раённых партыйных і совецкіх арганізацый і ўсіх работнікаў зямельнай сістэмы.

Толькі пры гэтай умове мы зможам выдатныя дасягненні стаханаўцаў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ордэнаноснай БССР за 1936 год зрабіць здабыткам шырокіх мас калгаснікаў і разгарнуць шырокае сацыялістычнае спаборніцтва за новыя рэкорды ўраджайнасці палёў і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі ў 1937 годзе.

Дасягненне высокіх вытворчых показальнікаў пад сілу кожнаму калгасу, соўгасу, кожнай ферме, брыгадзе і любому звяну. Патрабуецца толькі чэсная, адданая праца кожнага на сваёй рабоце, выдатнае авалоданне машыннай тэхнікай і новай стаханаўскай агратэхнікай сацыялістычнага земляробства.

Відома, што іменна працуючы па-большэвіцку, па-стаханаўску калгаснікі сельгасарцелей «Чырвоны партызан», Менскага раёна (старшыня ордэнаносец Бейне), «Чырвоны бераг», Аршанскага раёна (старшыня Багузаў), і інш. — дабіліся ў 1936 г. па 20, 23, а на асобных участках па 30 цэнтнераў зярна з гектара. За свае дасягненні яны ўдастоены ганаровага права ўдзелу ва ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1937 года. Гэтыя калгасы адзнымі з першых зацверджаны кандыдатамі ў экспаненты ўсесаюзнай выстаўкі.

Як сапраўдныя большэвікі, людзі памянёных калгасаў не супакойваюцца на дасягнутых поспехах. Яшчэ ў 1936 годзе яны разгарнулі шырокую практычную падрыхтоўку да веснавой сяўбы 1937 года, высока ўзняўшы сцяг сацыялістычнага спаборніцтва.

Магутны стаханаўскі рух пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ахапіў ужо большасць калгасаў нашай рэспублікі. У кожным з іх у 1936 годзе стаханаўскія звенні даказалі магчымасць атрымання небывалых раней ураджаяў зярна, бульбы, ільну і іншых культур. Цяпер задача заключаецца ў тым, каб, скарыстаўшы каштоўны вопыт стаханаўскіх звенняў, дабіцца ў 1937 годзе такіх высокіх ураджаяў на вялікіх калгасных масівах.

Ні адзін калгас, соўгас, ні адзін калгаснік не павінен застацца ўбаку ад барацьбы за сталінскі ўраджай па ўсіх культурах, за далейшы ўздым жывёлагадоўлі ў гэтым годзе.

Лепшыя людзі нашай калгаснай вёскі, якія дабіліся выдатных вынікаў ва ўсесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, атрымаюць права ўдзелу на ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Раённыя выставачныя камітэты і ўсе зямельныя работнікі абавязаны сістэматычна дапамагаць кандыдатам у экспаненты ўсесаюзнай выстаўкі па выніках 1936 года з тым, каб яны ў 1937 годзе перакрылі гэтыя свае дасягненні і сталі самымі перадавымі гаспадаркамі ў раёне па ўсіх галінах сельскагаспадарчай вытворчасці.

Трэба правесці ўзаемаправерку экспанентаў усесаюзнай выстаўкі па пытаннях падрыхтаванасці да веснавой сяўбы і па захоўванню экспанатаў ураджаю 1936 года. Кандыдаты ўсесаюзнай выстаўкі могуць правесці вялікую работу па перадачы свайго вопыту барацьбы за высокую вытворчасць працы, шляхам чыткі лекцый у калгасах, на масавых раённых курсах і т. д.

У кожнай раённай газеце трэба шырока асвятляць ход спаборніцтва за высокі ўраджай, за права ўдзелу ва ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Спецыялісты сельскай гаспадаркі павінны аказаць велізарнейшую дапамогу стаханаўцам у вялікай барацьбе за сталінскія 7—8 мільярдаў штогодняй вытворчасці зярна. Галоўны выставачны камітэт будзе запрашаць на ўсесаюзную выстаўку ў якасці ганаровых гасцей тых агранамаў і зоатэхнікаў, якія больш і лепш падрыхтуюць экспанэнтаў і экспанатаў для выстаўкі.

Выставачны камітэт БССР зацвердзіў першую групу кандыдатаў у экспаненты ўсесаюзнай выстаўкі ў колькасці 446 калгасаў, соўгасаў і звенняў, з якіх на жывёлагадоўлі зацверджана 111, па паляводству — 355. Па Менскаму раёну зацверджана 38 кандыдатаў, па Аршанскаму — 25 кандыдатаў у экспаненты.

Мы ўпэўнены, што ў 1937 годзе ў сельскай гаспадарцы Совецкай Беларусі вырастуць новыя тысячы герояў і гераінь працы, новыя атрады стаханаўцаў— адданых большэвіцкай партыі, новыя тысячы сталінскіх пітомцаў.

Па закліку калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны партызан», Менскага раёна, у гонар Сталінскай Канстытуцыі паміж калгасамі Беларусі разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай. Вялікая хартыя народаў— Сталінская Канстытуцыя сацыялізма, зацверджаная Надзвычайным VIII З'ездам Советаў СССР і Надзвычайным XII Усебеларускі З'езд Советаў, які збіраецца 15 лютага для зацвярджэння Канстытуцыі БССР, — натхняюць мільёны калгаснікаў, рабочых соўгасаў і МТС і ўсіх зямельных работнікаў на барацьбу за новыя перамогі ў сацыялістычнай сельскай гаспадарцы.

Дзякуючы дапамозе, аказваемай нашай распубліцы з боку партыі, урада СССР, брацкіх рэспублік Саюза і бацькаўскім клопатам любімага правадыра народу таварыша **Сталіна** — БССР атрымлівае ў сацыялістычным будаўніцтве перамогу за перамогай. Мы маем усе магчымасці заваяваць пачэснае месца на ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы і дабіцца, каб павільён БССР быў адным з самых змястоўных і цікавых на выстаўцы. Трэба дабіцца таго, каб павільён БССР поўнасцю адлюстраваў усе багацці нашай ордэнаноснай распублікі і рост заможнасці і культуры беларускага народу.

ДАКУМЕНТЫ АБ БЯЗДУШНЫХ АДНОСІНАХ ДА ЧАЛАВЕКА

Совецкая дзяржава існуе 19 год. Уся гісторыя яе — гэта гісторыя барацьбы за лепшае жыццё працоўных. Апарат совецкай дзяржавы партыя і ўрад усямерна паляпшаюць, будуюць яго як апарат, чулы да патрэб чалавека, хутка рэагуючы на ўсе запатрабаванні працоўных. У асобных звеннях нашага апарата, аднак, ёсць яшчэ бюракратычныя скажэнні. Самазадаволеныя бюракраты і ворагі народу, трапляючы ў совецкі апарат, прабуюць пусціць яго на халасты ход, здзекваючыся над людзьмі, якія пападаюць да іх. Публікуемыя ніжэй дакументы гавораць аб наяўнасці такіх бяздушных бюракратычных адносін да чалавека ў апараце Наркомасветы БССР.

Казлоўскі Аркадзій Нікалаевіч скардзіўся старшыні СНК БССР тав. Галадзеду на несправядлівыя адносіны акружаючых яго людзей, школы, у якой ён вучыўся, і прасіў дапамогі. Тав. **Галадзед** даручыў свайму сакратарыяту накіраваць пісьмо наркому асветы тав. **Дзякаву** для прыняцця мер. Апошні не палічыў патрэбным асабіста выканаць распараджэнне старшыні Соўнаркома, а накіраваў пісьмо і даручэнне тав. Галадзеда работніку свайго апарата **Берлінай.** Замест дапамогі Берліна — гэты бяздушны бюракрат — накіравала ўсе матэрыялы ў школу глуханямых, учыніўшы такім чынам новы здзек над Казлоўскім.

ПІСЬМО КАЗЛОЎСКАГА

Дарагі таварыш Галадзед!

Чытаючы газеты, я бачу, што наша родная комуністычная партыя і совецкі ўрад горача клапоняцца аб дзецях сталінскага веку, каб з іх выходзілі людзі, авалодаўшыя ведамі. Аба мне-ж ніхто не клапоніцца, а толькі смяюцца. Мне 16 год. Я заўсёды думаю, што я буду рабіць? Я нічога не ўмею рабіць. Яшчэ з васьмі год нашы настаўнікі і дактары прызналі мяне дурнем. Не ведаю, праўда гэта ці не, але я навучыўся чытаць і пісаць. Пішу я дрэнна таму, што пішу левай рукой, а чытаю лепш тых, хто скончыў сямігодку. Мне вельмі хочацца вучыцца, а загадчык сямігодкі тав. Карпаў выганяе мяне са школы. Чытаю я вельмі многа кніг, а таксама і газеты. Прачытанае я магу растлумачыць, разбіраюся па гісторыі і палітыцы. На комсамольскіх палітзанятках адказваю лепш за комсамольцаў.

Усё гора ў тым, што мне далі клічку «дурань», «ненармальны». Працаваць і вучыцца мне ў сувязі з гэтым не даюць. А мяне гэта вельмі разгневіла і, кажучы праўду, я злю букваедамі ўсё заводскае кіраўніцтва. А яны потым смяюцца з мяне, у мяне тады вельмі душа баліць. Думаў я доўга аб гэтым і рашыў напісаць вам. Не можа быць, каб вы мне не аказалі дапамогі. Мне гаварылі, што ў Менску ёсць школа для нервовых рэбят і што можна туды папасці. Калі-б я ведаў, што мяне туды прымуць, я-б прыехаў. Я вельмі прашу вас, каб вы паставілі пытанне перад Наркомасветы аб прыняцці мяне ў гэту школу. А то з мяне выйдзе ці хуліган, ці нікчэмны чалавек, бо я не вучуся і нічога не раблю.

Я сын рабочага-пенсіянера, у сям'і апрача мяне 5 чалавек. Бацька атрымлівае пенсію 158 руб. 60 кап., маці працуе прачкай. Я жыву па шкляным заводзе «Кастрычнік», Асіпавіцкага раёна, станцыя Свіслач, Заходняя чыгунка.

КАЗЛОЎСКІ Аркадзій Міколаў.

РЭЗАЛЮЦЫЯ БЕРЛІНАЙ

Накіраваць у Беларускае аб'яднанне глуханямых Менск, Комсамольская 32 т. Раманчыку.

АБ ЧУЛАСЦІ Ў НАРКОМАСВЕЦЕ

Аб чуласці і сталінскіх клопатах аб жывым чалавеку за апошні час пішуць і гавораць вельмі многа. Але ёсць яшчэ людзі, для якіх пачуццё чуласці незнаёма. Аб гэтым расказвае ў сваім пісьме вучань Асіповіцкай няпоўнай сярэдняй школы Аркадзій Казлоўскі.

Цікавяні, нападкі — вось метады выхавання самадураў з Асіповіцкай школы. Абураны вучань піша пісьмо ў СНК БССР да тав. Галадзеда з просьбай дапамагчы яму. Тав. Галадзед адразу адгукнуўся. СНК з афіцыяльнай адносінай накіроўвае пісьмо Казлоўскага ў Наркомасветы для практычнага вырашэння гэтага пытання і дапамогі.

У Наркомасвеце на адносіне СНК з'яўляюцца розныя нумары і рэзалюцыі. Работнік Берліна, не прачытаўшы змест пісьма, піша вельмі мудрую рэзалюцыю: «Накіраваць у Беларускае аб'яднанне глуханямых т. Раманчыку». Вось вам чуласць работнікаў Наркомасветы да скарг працоўных. Гэта не першы выпадак.

В. РАМАНЧЫК.

Старшыня Беларускага аб'яднання глуханямых.

ВАРОЖАЯ РУКА У КАЛГАСЕ „ПРАВДА"

У калгасе «Правда», Ушацкага раёна, доўгі час бяскарна арудвала група антысовецкіх людзей. Гэта група складаецца з Тафарава Ніла — рахункавода калгаса, Тафарава Вадзіма — брата рахункавода, Васілеўскага Арсенія, Гайко Васіля. Усе яны з'яўляюцца сваякамі, іх падрыўную работу ўзначальваў былы ўдзельнік Кронштатскага мяцяжу Васілеўскі Лявон.

Гэта група сістэматычна цкавала калгасніцу-стаханаўку Васілеўскую Сцепаніду.

На агульным сходзе калгаснікаў 12 кастрычніка 1936 года, на якім замест 95 членаў арцелі прысутнічала ўсяго 28, Васілеўскі Лявон разам са сваёй кампаніяй дабіўся таго, што Васілеўская Сцепаніда была выведзена са складу праўлення. Атрача стаханаўкі Васілеўскай, са складу праўлення былі выведзены калгаснікі-ўдарнікі Бычкоўскі Рыгор, які выпрацаваў у 1936 г. 437 працадзён, і Васілеўскі Сцяпан, які выпрацаваў 358 працадзён. І гэта ў той час, калі ў выніку выключна дрэннай пастаноўкі працоўнай дысцыпліны ў 1936 годзе 35 калгаснікаў выпрацавала толькі да 50 працадзён.

Тут-жа на сходзе ў склад праўлення быў выбран кладаўшчык Васілеўскі Раман, хаця ён сістэматычна раскрадваў калгаснае дабро, што было выяўлена рэвізійнай камісіяй яшчэ ў ліпені 1936 года. Па кладовай за ім была растрата ў 5 тон хлеба, і ўсё-ж ён не быў прыцягнут да крымінальнай адказнасці.

У свой час стаханаўка Васілеўская Сцепаніда была вылучана на курсы жывёлаводаў, але гэтаму актыўна процідзейнічаў рахункавод калгаса Тофараў Ніл. Ён заявіў, што калі Васілеўская і паступіць на курсы, працадні ёй за час вучобы не будуць налічаны. Гайко Васіль нават пагражаў Васілеўскай забойствам.

Калгас у прарыве па выкананню дзяржаўнага плана жывёлагадоўлі. З 9 конематак ні адна ў 1936 годзе не ажарэбілася. У 1936 годзе пакрыта толькі 4 конематкі, з якіх адна ўжо абартавала. Па плану ў калгасе павінна быць 3 свінаматкі, але іх да гэтага часу не набылі. На 1 студзеня 1937 года ў калгасе ёсць усяго толькі 31 гал. рагатай жывёлы. Корм для калгаснай жывёлы знаходзіцца па хлявах калгаснікаў. Кантролю за выдаткаваннем кармоў няма.

Такое становішча жывёлагадоўлі ў калгасе ёсць вынік падрыўной работы антысовецкай групы Васілеўскага Лявона. Па ініцыятыве гэтай-жа групы сарвана падпіска на дзяржаўную пазыку 1936 года, сарвана будаўніцтва канюшні і канцылярыі, тармазілася здача і продаж хлеба дзяржаве, паніжаны нормы выпрацоўкі ў калгасе.

Так на працягу некалькіх гадоў класавы вораг арудваў у калгасе «Правда». Гэтага не заўважалі райком КП(б)Б і райвыканком. Кіраўнікі раёна не бачылі гэтага, хаця аб агіднасцях у калгасе два разы выступала раённая газета «Прымежны комунар». Толькі 24 студзеня гэтага года, калі ўсе агідныя факты былі ўстаноўлены на месцы прадстаўніком Камісіі партыйнага кантролю, Ушацкі РК КП(б)Б вынес рашэнне аб гэтым калгасе. У сваім рашэнні райком КП(б)Б пераклаў усю віну на первічную партыйную арганізацыю. На самой-жа справе тут не мала віны райкома і райвыканкома, якія ўвесь час былі глухімі да паступаючых сігналаў. РК КП(б)Б у сваёй пастанове абышоў маўчаннем і той факт, што ў верасні 1936 года калгас «Правда» наведваў інструктар райкома Арцямёнак, у прысутнасці якога ў калгасе абмяркоўвалася пытанне аб перавыбарах праўлення.

Ушацкі РК КП(б)Б і РВК не зрабілі належных палітычных вывадаў з фактаў шкодніцкай работы класавага ворага ў калгасе «Правда». А вывады гэтыя павінны быць зроблены.

А. КРУГЛІК,
І. ЯРМАКОЎ.

НЯВЫКАНАНАЕ АБЯЦАННЕ

Пісьмо інжынерна-тэхнічных работнікаў магілеўскага трубаліцейнага завода імя Мяснікова

19 кастрычніка 1936 года на заводзе быў атрыман загад Белметалатраста за № 175. У ім гаварылася аб важнасці сістэматычнага павышэння кваліфікацыі інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў трэста і патрабавалася ад кіраўніцтва завода ў пяцідзённы тэрмін падаць інстытуту павышэння кваліфікацыі вучэбны заказ і персанальны спіс вылучаных інжынерна-тэхнічных работнікаў для вучобы ў гэтым інстытуце. Адначасова паведамлялася, што сістэматычная вучоба для інжынерна-тэхнічных работнікаў менскіх заводаў будзе арганізавана з 15 кастрычніка 1936 года, а для інжынерна-тэхнічных работнікаў заводаў іншых гарадоў БССР — у студзені 1937 года.

Кіраўніцтва завода дакладна выканала загад — накіравала вучэбны заказ і персанальны спіс 26 асоб, вылучаных для навучання ў інстытуце павышэння кваліфікацыі. Для таго, каб лепш падрыхтавацца да заняткаў у інстытуце, мы арганізавалі на заводзе гурток.

Падыходзіць вызначаны трэстам час пачатку заняткаў, але да арганізацыі філіяла інстытута нават яшчэ не прыступлена. Заводакіраўніцтва некалькі разоў зварачалася ў аддзел кадраў Белметалатраста і інстытут, але адказу не атрымлівала.

Мы лічым такое становішча ненармальным. На нашым заводзе ёсць 26 майстроў, якія маюць сярэднетэхнічную асвету. Пры тым вялікім росце тэхнічных ведаў рабочых, якія навучаюцца ў шматлікіх гуртках пры заводзе, сістэматычнае павышэнне тэхнічнага ўзроўню майстроў з'яўляецца выключна неабходнай справай.

Мы вымушаны звярнуцца праз «Звязду» і прасіць аб хутчэйшым адкрыцці пры нашым заводзе філіяла інстытута павышэння кваліфікацыі інжынерна-тэхнічных работнікаў.

22 ПОДПІСЫ.

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА КАМІТЭТА КП(б)Б

1. Пленум гаркома падкрэслівае, што адзначаныя недахопы ў правядзенні партыйных сходаў у партарганізацыях фабрыкі «Комунарка» і Наркомасветы маюць месца ў большасці пярвічных партарганізацый: у радзе выпадкаў партсходы праводзяцца фармальна, на нізкім ідэйна-палітычным узроўні, абмеркаванні пытанняў унутрыпартыйнага жыцця часта носяць дзяляцкі характар (МІІ, завод імя Молатава, палітэхнічны інстытут, мэдінстытут, завод імя Варашылава і інш.).

Асноўным недахопам большасці пярвічных партарганізацый з'яўляецца недастаткова разгорнутая большэвіцкая самакрытыка на партыйных сходах, кіраўнікі партыйных арганізацый дрэнна яшчэ прыслухоўваюцца да голасу комуністаў і беспартыйных мас, што стварае глебу для развіцця элементаў сямейнасці і благадушша і прыводзіць да прытуплення рэволюцыйнай пільнасці.

Толькі гэтым можна вытлумачыць, што ўжо пасля праверкі і абмену партдакументаў некаторыя партарганізацыі не здолелі своечасова выкрыць яўных ворагаў народу (Багданскі—ВКСГШБ, Рабкавец—радыёкамітэт, Лявошын — «Чырвоная змена»).

Партыйныя сходы яшчэ не сталі баявой школай большэвіцкага выхавання і ідэйнай загартоўкі комуністаў і не стаяць у цэнтры ўвагі партыйнай работы парткомаў і парторгаў пярвічных партыйных арганізацый.

2. Пленум гаркома лічыць, што асноўным і галоўным недахопам у рабоце большасці пярвічных партарганізацый з'яўляецца тое, што статут партыі яшчэ не стаў асновай партыйнага жыцця, а ў радзе выпадкаў сакратары парткомаў грубейшым чынам парушаюць статут партыі (тэрміны паўнамоцтваў парткомаў ва многіх партарганізацыях даўно зышлі, сакратары парткомаў не адчытваюцца перад партарганізацыяй аб сваёй рабоце, аб выкананні рашэнняў папярэдніх партсходаў і т. д.).

3. Партыйныя камітэты праяўляюць недастаткова ўвагі папярэдняй падрыхтоўцы і падбору парадку дня партыйных сходаў, праяўляюць вельмі слабую ўласную ініцыятыву ў пастаноўцы пытанняў арганізацыйна-партыйнай і ідэйна-выхаваўчай работы сярод комуністаў (абмяжоўваючыся ў большасці выпадкаў пытаннямі, рэкамендаванымі гаркомам і горрайкомамі), недастаткова ўлічваецца думка комуністаў. Большасць пытанняў партарганізацыі ставяць у агульнай, а не канкрэтнай пастаноўцы і не заўсёды ўвязваюць абмеркаванне агульных пытанняў палітыкі партыі з канкрэтнымі фактамі з жыцця партарганізацыі. Рашэнні партсходаў часта выносяцца неканкрэтныя.

4. Важнейшыя пытанні з жыцця і работы пярвічных партарганізацый (пытанні палітычнай агітацыі, аб партыйнай прапагандзе і аб рабоце гурткоў і прапагандыстаў, пытанні стаханаўскага руху) не знаходзяць дастатковага адлюстравання ў парадку дня агульных партыйных сходаў.

5. Пленум гаркома лічыць, што бюро гаркома і бюро горрайкомаў нясуць прамую адказнасць за факты грубага парушэння статута партыі ў пярвічных партарганізацыях. Бюро гаркома і горрайкомаў зусім недастаткова ўдзялялі ўвагі канкрэтнаму кіраўніцтву і дапамозе пярвічным партарганізацыям па правядзенню партыйных сходаў, не займаліся абагуленнем матэрыялаў і падвядзеннем вынікаў праведзеных партдзён і пастаноўкай перад пярвічнымі і раённымі партарганізацыямі пытанняў, якія выцякаюць з гэтых матэрыялаў.

Зусім недастаткова жывая сувязь членаў бюро гаркома і горрайкомаў і непасрэдны іх уезд на агульных партыйных сходах, асабліва совецкіх і дробных партыйных арганізацый.

***

Пленум гаркома прапануе бюро гаркома і горрайкомаў і ўсім пярвічным партарганізацыям:

1. На партыйных сходах галоўную ўвагу аддаць абмеркаванню пытанняў, што вынікаюць са статута партыі, які з'яўляецца асновай партыйнага жыцця, у прыватнасці, аб членах партыі і іх абавязках (§§ 1 і 2 статута); аб пярвічных арганізацыях партыі (§§ 48—51); пытанні партпрапаганды, палітычнай агітацыі; аб авангардная ролі комуністаў і т. п.

Пленум гаркома падкрэслівае выключнае значэнне арганізуючай і адказнай ролі сакратара партыйных камітэтаў і іх персанальную адказнасць за найстражэйшае захаванне статута партыі, за захаванне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і папярэджвае сакратароў парткомаў, што яны нясуць персанальную адказнасць перад партыйнай арганізацыяй і вышэйшымі партыйнымі органамі за няўхільнае правядзенне статута партыі ў сваёй партарганізацыі.

2. Пленум гаркома, указваючы сакратарам парткомаў, што яны часта ігнаруюць членаў парткома і работу парткома ў цэлым, — абавязвае сакратароў парткомаў падняць ролю і адказнасць кожнага члена гаркома і парткома ў цэлым за пастаноўку партыйнай работы, стварыўшы ўсе неабходныя ўмовы для актыўнага ўдзелу ўсіх членаў парткома ў рашэнні ўсіх пытанняў партыйнага жыцця партарганізацыі.

3. У сувязі з тым, што многія пярвічныя партарганізацыі не выканалі дырэктыву партыі аб перыядычнай справаздачнасці парткомаў і груба парушылі § 51 статута партыі аб выбарах парткома тэрмінам на адзін год, — абавязаць пярвічныя партарганізацыі правесці справаздачы парткомаў аб сваёй рабоце па агульных партыйных сходах, даручыўшы горрайкомам арганізаваць перавыбары парткомаў і парторгаў пярвічных партарганізацый, тэрмін паўнамоцтваў якіх, прадугледжаны статутам партыі, ужо скончыўся.

Папярэдзіць усіх сакратароў парткомаў і парторгаў, што яны абавязаны пэрыядычна (не радзей аднаго разу ў тры месяцы) адчытвацца па партыйных сходах аб сваёй рабоце і па кожным партсходзе адчытвацца аб выкананні рашэнняў папярэдніх партыйных сходаў.

4. Рашуча змагаючыся супроць фактаў парушэння членамі і кандыдатамі партыі партдысцыпліны, абмяркоўваючы па парткоме і партсходах факты няўкі і спазнення на партсходы, партком і парторгі павінны дабіцца падняцця партыйнай дысцыпліны комуністаў і іх адносін да партсходаў, адначасова забяспечваючы дадатковую прапрацоўку пытанняў, абмеркаваных па партсходах з комуністамі, якія не прымалі ўдзелу на праведзеных партыйных сходах.

5. Пленум гаркома лічыць зусім няправільным, што многія пярвічныя партарганізацыі значна скарацілі колькасць агульных фабрычных партыйных сходаў, штучна ствараючы ва многіх выпадках не прадугледжаныя статутам партыі цэхавыя партыйныя групы, ставячы на абмеркаванне гэтых партгруп не ўласцівыя ім пытанні.

Пленум даручае бюро гаркома і горрайкомаў перагледзець структуру пярвічных партыйных арганізацый, ліквідаваць штучна створаныя парткрупы з тым, каб партыйныя групы, дзе такавыя прадугледжаны статутам партыі, займаліся-б, галоўным чынам, пытаннямі, якія выцякаюць з пастаноў агульных партсходаў і парткома, і памячэннем канкрэтных партыйных даручэнняў кожнаму члену і кандыдату партыі па забеспячэнню правядзення ў жыццё дырэктыў партыі.

6. Пленум гаркома папярэджвае супроць грубых скажэнняў, мэўных месца ў асобных партарганізацыях (фабрыка «Комунарка» і інш.), калі замест глыбокай работы з кожным комуністам у паасобку і дапамогі ім у палітычным росце і прыцягнення комуністаў да выканання партыйных даручэнняў па падрыхтоўцы да партсходаў — практыкуецца так званая «падрыхтоўка» комуністаў, якіх абавязваюць выступаць на партыйным сходзе.

7. У мэтах узмацнення сувязі і кіраўніцтва пярвічнымі партарганізацыямі ў галіне правядзення партыйных сходаў:

а) Члены бюро і інструктары гаркома і горрайкомаў у партыйныя дні павінны прымаць удзел на партыйных сходах, пасля чаго яны абавязаны інфармаваць гарком і горрайкомы аб рэзультатах партсходаў, па якім яны прымалі ўдзел, высоўваючы асобныя пытанні на абмеркаванне бюро гаркома і горрайкомаў.

Бюро гаркома і горрайкомаў у большай меры павінны прыцягваць да выканання партыйных даручэнняў па ўдзелу ў партсходах членаў пленумаў гаркома і горрайкомаў.

б) Рэгулярна праводзіць перыядычныя нарады сакратароў парткомаў і парторгаў па абмену вопытам правядзення партсходаў (як па раёнах, так і па асобных групах — вытворчыя, совецкія, вузаўскія, дробныя пярвічныя партарганізацыі). Нарады праводзіць як па агульных, так і па асобных канкрэтных пытаннях (напрыклад: «як лепш падрыхтаваць партсход», «аб падборы і падрыхтоўцы дакладчыкаў» і т. д.).

в) Гарком, горрайкомы і пярвічныя партарганізацыі павінны перыядычна абагульваць матэрыялы і падводзіць вынікі правядзення партсходаў, ставіць на сакратарыяце, бюро гаркома і горрайкомаў і на парткомах асобныя канкрэтныя пытанні партсходаў, прапановы комуністаў і на аснове гэтых матэрыялаў высоўваць перад раённымі і гарадской партарганізацыямі пытанні, якія выцякаюць з практыкі правядзення партыйных сходаў.

8. Абавязаць пярвічныя партыйныя арганізацыі:

а) Парадак дня і мерапрыемствы па падрыхтоўцы партсходаў абавязкова абмяркоўваць на пасяджэннях парткомаў з папярэднім улікам думак комуністаў па гэтаму пытанню.

б) Асаблівую ўвагу аддаць падбору дакладчыкаў, аказваючы ім дапамогу ў падрыхтоўцы і практыкуючы папярэднюю праверку канспектаў і матэрыялаў дакладчыкаў, маючы на ўвазе, што ад дакладчыка ў значнай ступені залежыць наколькі правільна члены і кандыдаты партыі ўсвояць рашэнні партыі, што дакладчык фармуе свядомасць комуністаў.

в) Праводзячы, як правіла, закрытыя партсходы, пярвічныя партарганізацыі павінны таксама практыкаваць правядзенне адкрытых партсходаў, умела падбіраючы парадак дня гэтых сходаў і забяспечваючы ўдзел на адкрытых партсходах спачуваючых і беспартыйнага актыва.

г) Рэкамэндаваць партарганізацыям агульныя партыйныя сходы, як правіла, праводзіць не адразу пасля работы і ствараць усе неабходныя ўмовы для правядзення партсходаў.

9. Пленум гаркома абавязвае бюро гаркома і горрайкомаў звярнуць асаблівую ўвагу на ўзмацненне кіраўніцтва і дапамогі ў наладжанні партыйнай работы і правядзення агульных партыйных сходаў у совецкіх, вузаўскіх і дробных партарганізацыях.

10. Пленум гаркома абавязвае бюро гаркома і горрайкомаў наладзіць уважлівае вывучэнне і аператыўнае рэагаванне па пратаколах пярвічных партарганізацый і на канкрэтных прыкладах выхоўваць пярвічныя партарганізацыі як у пастаноўцы і вырашэнні пытанняў, так і ў афармленні і наладжанні пратакольнай гаспаддаркі.

11. Пленум гаркома падкрэслівае, што рашэнне ЦК ВКП(б) аб рабоце растоўскага гаркома ВКП(б) з'яўляецца сур'ёзным папярэджаннем для ўсіх партыйных арганізацый у справе змянення мэтадаў кіраўніцтва пярвічнымі партарганізацыямі і ўзмацнення сапраўднай рэволюцыйнай пільнасці. Партыйныя арганізацыі штодзённым паляпшэннем унутрыпартыйнай работы павінны дабіцца агульнага ўздыму ўсёй партыйнай работы і павышэння большэвіцкай загартоўкі і боездольнасці комуністаў, працягваючы бязлітаснае выкрыццё контррэволюцыйных трацкісцка-зіноўеўскіх бандытаў і іх пасобнікаў з лагера правых і «леваку».

Паляпшэнне якасці і ідэйна-палітычнага ўзроўню партыйных сходаў павінна забяспечыць актыўны ўдзел комуністаў у абмеркаванні пытанняў партыйнага жыцця, развіццё большэвіцкай самакрытыкі, што з'яўляецца важнэйшай умовай у справе падняцця сапраўднай большэвіцкай пільнасці комуністаў.

Сакратар Менскага гаркома КП(б)Б
РЫСЬКІН.



У партгабінеце завода імя Кірава (Менск). НА ЗДЫМКУ (злева направа): агітатары Шчурэвіч А. Н., Скрыпко С. Г. і сакратар комсамольскага камітэта завода Лазарава В. І. за чыткай і вывучэннем праекта Канстытуцыі БССР.

Фото С. Грына і В. Лейна. (БСФ).

СТАТУТ ПАРТЫІ— АСНОВА ПАРТЖЫЦЦЯ

У параграфе 49 статута партыі ў разделе «Аб пярвічных арганізацыях партыі» ўказана:

«У буйных прадпрыемствах, установах, калгасах і т. п. з вялікай колькасцю комуністаў (ад 100 членаў да 3.000 і вышэй) унутры агульнай пярвічнай партыйнай арганізацыі, якая ахапляе ўсе прадпрыемствы, установы і т. п., могуць быць арганізаваны ў кожным асобным выпадку з зацвярджэння райкома-гаркома або адпаведнага палітаддзела — партыйныя арганізацыі па цэхах, участках, аддзелах і т. п....».

Такім чынам, статут партыі зусім ясна ўстанаўлівае, што цэхавыя партарганізацыі могуць быць арганізаваны толькі ў буйных партарганізацыях, якія налічваюць не менш 100 членаў, прычым нават у гэтых партарганізацыях цэхавыя партарганізацыі могуць быць арганізаваны ў кожным асобным выпадку толькі з зацвярджэння райкома-гаркома партыі.

Між тым у Менскай партарганізацыі (і ў радзе іншых арганізацый КП(б)Б) гэты пункт статута партыі скрозь і ўсюды парушаецца.

Пярвічныя партарганізацыі фабрык «Комунарка», імя Куйбышэва, завода «Ударнік» і раду іншых, якія налічваюць ад 30 да 50 комуністаў, стварылі ўнутры партарганізацыі рад цэхавых партыйных арганізацый. Прычым, не толькі ў вытворчых, але нават у большасці партарганізацый совецкіх устаноў таксама створаны партгрупы ў кіраўніцтвах і аддзелах.

Для таго, каб характарызаваць работу гэтых цэхавых партыйных груп, дастаткова прывесці некаторыя прыклады:

У партарганізацыі фабрыкі «Комунарка» ў партгрупе бісквітнага цэха — 4 чалавекі, кандэцерскага цэха — 4 чалавекі, самая вялікая колькасць комуністаў у партгрупах мяккашакаладнага і карамельнага цэхаў (прыкладна, па 13—15 чалавек). Існуе нават так званая цэхавая партгрупа падсобных цэхаў.

Чым-жа займаюцца гэтыя цэхавыя партгрупы?

У партарганізацыі Наркомасветы партгрупа Будаўнічага кіраўніцтва абмяркоўвае даклад начальніка Будкіраўніцтва аб выкананні плана будаўніцтва па БССР.

Партгрупа бісквітнага цэха (у якой усяго 4 чалавекі) слухае пытанне аб вучобе члена партыі тав. Анейчыка і выносіць наступнае рашэнне: «Паколькі Анейчык сама не лічыць матчымым далейшае прабыванне ў партыі — задаволіць яе просьбу аб выключэнні з партыі».

Партгрупа карамельнага цэха па самасправаздачы спачуваючага Мілера выносіць наступнае рашэнне:

«Калі Мілер абяцае выправіцца, тады партгрупа будзе ўзмоцнена рыхтаваць яго ў партыю, а калі Мілер будзе працягваць сваю тэорыю, прыдзецца паставіць пытанне больш рэзка».

Можна было-б прывесці яшчэ рад падобных фактаў. Аб чым усё гэта гаворыць? Гэта ўказвае не толькі на тое, што стварэннем гэтых партгруп пярвічныя партарганізацыі парушылі статут партыі, але і на тое, што гэтым партгрупам перадаверана абмеркаванне раду важнейшых пытанняў партыйнага жыцця. Партыйны камітэт і яго сакратар замест глыбокай, крапатлівай работы з кожным асобным членам і кандыдатам партыі стварыў штучны бар'ер паміж комуністам і парткомам. Сакратар парткома ў некаторых выпадках адчувае сябе ў ролі падрайкома, які займаецца «кіраўніцтвам увогуле і ў цэлым».

Такое становішча прывяло да прыніжэння ролі агульнага партыйнага схода. Ва многіх пярвічных партыйных арганізацыях агульныя партыйныя сходы склікаюцца вельмі рэдка. У Акадэміі навук за 1936 год праведзена ўсяго 10 агульных партыйных сходаў, на заводзе імя Кірава — 15 агульных партыйных сходаў і т. д. У той-жа час на абмеркаванне так званых цэхавых партсходаў ставяцца важнейшыя пытанні партжыцця. Важнейшае пытанне — аб рашэннях III пленума КПК—у партарганізацыях фабрыкі імя Куйбышэва, завода імя Кірава і інш. абмяркоўвалася на цэхавых партсходах.

Гэту практыку, якая мела месца ў радзе арганізацый КП(б)Б, трэба неадкладна спыніць.

Л. ЭПШТЭЙН.

З ВЫСТУПЛЕННЯЎ НА ПЛЕНУМЕ МЕНГАРКОМА

ГЕФЕН — сакратар парткома фабрыкі імя Кагановіча.

Пастаноўка на пленуме гаркома пытання аб практыцы правядзення партыйных сходаў мае выключна важнае значэнне для нас, сакратароў парткомаў. Пленум гаркома, наколькі я ведаю, упершыню займаецца гэтым пытаннем у такой канкрэтнай пастаноўцы.

Трэба сказаць, што райком і гарком партыі недастаткова дапамагаюць пярвічным арганізацыям. Возьмем такі прыклад. Да нас прышла камісія Кагановіцкага райкома партыі для праверкі становішча палітычнай агітацыі. Члены камісіі на працягу некалькіх дзён правяралі нас, гутарылі з партыйным актывам, з сакратаром парткома. Але самага галоўнага — пабываць у цэхах і паглядзець канкрэтную работу агітатара, паслухаць бяседчыка, чытальніка — яны не зрабілі. Камісія нават не азнаёміла партыйны камітэт са сваімі вывадамі і прапановамі.

У нас на партыйных сходах за 1936 год два разы быў сакратар райкома, адзін раз інструктар райкома і адзін раз інструктар гаркома. Гэта ў партарганізацыі фабрыкі імя Кагановіча, дзе, відавочна, прадстаўнікі гаркома і райкома часцей бываюць. А калі ўзяць больш дробныя партарганізацыі, то там і такой сувязі няма. Па-мойму, трэба значна ўзмацніць жывую сувязь гаркома і райкома з пярвічнымі партарганізацыямі.

***

КАНОПІК — сакратар парткома фабрыкі «Кастрычнік».

У нашай партарганізацыі мы за апошні час (у сувязі з правяркай і абменам партдакументаў) маем бясспрэчнае паляпшэнне якасці падрыхтоўкі і правядзення партыйных сходаў.

Аднак, і за апошні час мы мелі рад фактаў, якія сведчаць аб тым, што мы яшчэ недастаткова зразумелі значэнне партсходу, як школы большэвіцкага выхавання комуністаў.

Зусім правільна нам было ўказана ў газеце «Звязда» аб фармальным падыходзе, калі мы на адным сходзе паставілі пытанне аб зняцці партспагнанняў з 10 комуністаў. Або ўзяць такі прыклад. Мы на партсходзе ставім пытанне аб правядзенні стаханаўскага дэкадніка замест таго, каб паставіць пытанне аб авангардная ролі комуністаў у стаханаўскім руху.

Мы маем у нашай партарганізацыі і такія факты, калі на партсходах па розных уважлівых прычынах адсутнічаюць у сярэднім 20—25 комуністаў, а пытанні, якія мы абмяркоўвалі, з гэтымі комуністамі дадаткова не прапрацоўваем. Такім чынам, вялікая група комуністаў не ведае рашэнняў партыйных сходаў і, зусім ясна, не могуць быць праваднікамі гэтых рашэнняў у масах.

***

БРУДНЕР — сакратар парткома фабрыкі імя Куйбышэва.

Праверка і абмен партыйных дакументаў садзейнічалі агульнаму ўздыму партыйнай работы. Бясспрэчна, узнялася якасць і ідэйны ўзровень партыйных сходаў.

Але ці можна ў сувязі з гэтым сказаць, што партыйныя сходы сталі сапраўднай школай большэвіцкага выхавання комуністаў? Не! Нельга яшчэ гэтага сказаць. Асноўная прычына, па-мойму, у тым, што мы, сакратары парткомаў, недастаткова зразумелі значэнне партсходаў і ў сувязі з гэтым не зусім сур'ёзна адносімся да іх падрыхтоўкі, да падбору парадку дня. Нельга таксама абыйсці і той факт, што большэвіцкая крытыка і самакрытыка ў нас недастаткова разгорнута, а гэта прыводзіць даволі часта да прытуплення большэвіцкай пільнасці.

Значная доля віны ў гэтых недахопах падае на райкомы і гарком партыі. Вельмі слаба праводзіцца абмен вопытам работы. У большасці выпадкаў нас выклікаюць у райком ці ў гарком, калі выяўляецца якінебудзь прарыў і калі патрэбна, як гаворыць, «пакачаць» сакратароў парткомаў. Гэты метад сёння ўжо непрыгодны. Вядома, трэба нас падцягваць, але адначасова і ў большай меры неабходна дапамагаць і вучыць пізавых партработнікаў. У гэтай частцы вялікае значэнне маюць нарады па абмену вопытам работы.

А. Б. РЫСЬКІН

АБ ПАРТЫЙНЫХ СХОДАХ

На апошнім пленуме Менскага гаркома КП(б)Б было пастаўлена пытанне аб практыцы правядзення партыйных сходаў у Менскай партарганізацыі. На пленуме гаркома былі заслуханы даклады сакратароў парткомаў фабрыкі «Комунарка»—тав. Рабкіна і Наркомасветы—тав. Пармона.

Для кожнага комуніста вядома, якое значэнне мае партсход у справе большэвіцкага выхавання членаў партыі. Партыйны сход, як у люстры, паказвае па сутнасці ўсю работу пярвічнай партарганізацыі. Партсход адыгрывае выключную ролю ў справе ўсямернага ўзмацнення большэвіцкай пільнасці, ідэйнай загартоўкі кожнага комуніста ў паасобку і ўсёй партарганізацыі ў цэлым. Добрая падрыхтоўка партыйнага схода, высокі ідэйны ўзровень яго правядзення, большэвіцкая самакрытыка, дакладнасць і канкрэтнасць рашэнняў, добра пастаўленая праверка выканання прынятых партыйным сходам рашэнняў — гэта галоўнае ў рабоце партыйнай арганізацыі. Такія пытанні, як найстражэйшае правядзенне ў жыццё статута партыі, пытанні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, справаздачнасці і выбарнасці парткомаў і парторгаў, партыйнай прапаганды і агітацыі і т. д. абмеркаванне і правядзенне ў жыццё рашэнняў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б маюць сваёй асноўнай задачай ідэйную, большэвіцкую загартоўку членаў і кандыдатаў партыі.

Пленум гаркома, які праходзіў з вялікай актыўнасцю, даў адзнаку становішча падрыхтоўкі і правядзення партыйных сходаў не толькі ў тых арганізацыях, якія адчываліся на пленуме, але і ва ўсёй Менскай партарганізацыі.

Работа пленума паказала, што кіраўнікі пярвічных партыйных арганізацый, работнікі райкомаў і гаркома да канца не засвоілі і не зразумелі таго значэння, якое мае партсход у жыцці партарганізацыі. Ні райкомы партыі, ні гарком партыі глыбокім вывучэннем правядзення партсходаў, абагуленнем вопыту, кіраўніцтвам і дапамогай пярвічным партарганізацыям як след не займаліся.

У Менскай партарганізацыі налічваецца 343 пярвічных партарганізацыі з агульнай колькасцю 7100 членаў і кандыдатаў партыі. Прычым 65 проц. усіх комуністаў знаходзяцца ў совецка-гандлёвых і вузаўскіх партарганізацыях.

Па свайму складу большасць пярвічных партарганізацый малакольксныя (да 10 комуністаў — 192 пярвічных партарганізацыі і ад 11 да 20 комуністаў — 85 пярвічных партарганізацый, г. зн. да 80 проц. усіх пярвічных партарганізацый налічваюць усяго толькі да 20 комуністаў).

І вось, калі мы можам аднесці некаторыя паляпшэнні ў падрыхтоўцы і правядзенні партсходаў да групы вытворчых з больш буйных партарганізацый, то гэтага нельга сказаць у адносінах большасці совецкіх і асабліва вузаўскіх партарганізацый.

Даклад сакратара парткома партарганізацыі Наркомасветы т. Пармона і спрачкі па дакладу на пленуме гаркома з усёй паўнатой паказалі, што ў партарганізацыі Наркомасветы партыйныя сходы яшчэ не сталі баявой школай большэвіцкага выхавання і ідэйнай загартоўкі комуністаў. Большасць партсходаў праведзена фармальна, без адпаведнай падрыхтоўкі, ідэйна-палітычны ўзровень раду партсходаў вельмі нізкі, абмеркаванне пытанняў унутрыпартыйнага жыцця часта носіць дзяляцкі характар. На партсходах недастаткова разгорнута большэвіцкая самакрытыка, што стварае глебу для развіцця элементаў сямейнасці і благадушша і прыводзіць да прытуплення партыйнай пільнасці.

Члены і кандыдаты партыі партарганізацыі Наркомасветы і ў першую чаргу сакратар парткома тав. Пармон і партком у цэлым не зрабілі для сябе ўсіх неабходных палітычных і практычных вываўдаў з вынікаў праверкі і абмену партдакументаў, з фактаў засмечання трацкісцкімі і нацдэмаўскімі элементамі, якія мелі месца ў партарганізацыі. Карэнні контррэволюцыйнай трацкісцкай і нацдэмаўскай работы ў партарганізацыі яшчэ да канца не выкарчаваны.

Возьмем, напрыклад, партарганізацыю Упоўнаркамсувязі. Вось асобныя факты з апошняга перыяда работы гэтай партарганізацыі: 7 снежня 1936 года на партсходзе гэтай партарганізацыі слухалі пытанне аб парткіраўніцтве комсамолам. «Партпрымапаваны» тав. Мерзуеў на партсходзе заяўляе: «Я, як партпрымапаваны, з даручаным заданнем не магу справіцца з-за занятасці па службе». Партсход па гэтаму пытанню прымае наступную пастанову: «Інфармацыю прыняць да ведама. Даручыць парткому вылучыць партпрымацаваным да комсамола больш свабоднага ад вытворчасці члена партыі».

Гэта называецца ў партарганізацыі партыйным кіраўніцтвам комсамола. Для партарганізацыі не важна які член партыі будзе выхоўваць комсамольцаў, абы гэты чалавек меў-бы вольны «ад вытворчасці» час. Няжка знайсці больш дзяляцкага, антыпартыйнага падыходу да вырашэння такога важнейшага пытання, якім з'яўляецца партыйнае кіраўніцтва комсамолам. Ці возьмем такое рашэнне партсхода.

«Слухалі: інфармацыю т. Сапрапава аб выкананні партыйных даручэнняў.

Пастанавілі: інфармацыю прыняць да ведама і няўхільнага выканання».

Хіба такое рашэнне можа з'явіцца большэвіцкім выхаваннем членаў партыі?

Не лепш становішча з падрыхтоўкай і правядзеннем партсходаў у вузаўскіх партарганізацыях. Яркім прыкладам можа з'явіцца партарганізацыя Менскага педагагічнага інстытута. Узровень партыйных сходаў у гэтай партарганізацыі надзвычай нізкі, рашэнні прымаюцца падзяляцку, якія часта нічым не адрозніваюцца ад дробных распараджэнняў камендантаў і загадчыкаў гаспаддаркі. Замест таго, каб разгарнуць сапраўдную большэвіцкую самакрытыку — партком і рад комуністаў займаюцца на партсходах балбатнёй аб пільнасці.

Становішча ў вузаўскіх партарганізацыях патрабуе, каб гарком і райкомы сур'ёзна заняліся пастаноўкай партыйна-масавай работы ў гэтых партарганізацыях.

Напярэдадні пленума гаркома на агульным партыйным сходзе партарганізацыя электрастанцыі падводзіла вынікі правядзення партыйных сходаў. Партсход пастанаўляе: «Партыйныя сходы ў партарганізацыі па свайму зместу адбываліся на дастатковым ідэйна-палітычным узроўні». Тут-жа ніжэй, пасля такога самахвальства, партсход павінен быў адзначыць «недастатковую падрыхтоўку партсходаў», «паслабленне партыйнай дысцыпліны ў партарганізацыі» і т. д.

Як-жа можна сумясціць высокі ідэйна-палітычны ўзровень партсходаў з слабай падрыхтоўкай партсходаў, з паслабленнем партыйнай дысцыпліны і т. д. Гэты факт гаворыць аб тым, што узровень партыйнай работы ў гэтай арганізацыі нізкі. У партарганізацыі электрастанцыі не разумеюць, што значыць высокі ідэйна-палітычны ўзровень партсходаў.

А партарганізацыя электрастанцыі ва ўмовах Менска—не маленькая арганізацыя. Тут часцей бываюць прадстаўнікі гаркома і райкома. А калі ўзяць групу дробных партарганізацый, дзе работнікі райкомаў і гаркома бываюць вельмі рэдка — там становішча яшчэ горшае.

Асноўным і галоўным недахопам у рабоце большасці пярвічных партарганізацый з'яўляецца тое, што статут партыі яшчэ не стаў асновай партыйнага жыцця. Статут партыі ва многіх пярвічных партыйных арганізацыях Менска груба парушаецца. У гэтай сувязі варта спыніцца на двух пытаннях: аб цэхавых партгрупах і аб справаздачнасці і выбарнасці парткомаў.

Ва многіх партарганізацыях існуюць не прадугледжаныя статутам партыі цэхавыя партыйныя групы. У статуце партыі сказана, што цэхавыя парткрупы могуць быць арганізаваны толькі ў буйных партарганізацыях, якія налічваюць у сябе 100 і звыш членаў партыі, прычым такавыя арганізоўваюцца ў кожным асобным выпадку з зацверджання райкома—гаркома.

Апрача парушэння статута партыі гэта, безумоўна, прывяло да пагаршэння партыйнай работы ў гэтых партарганізацыях, бо замест работы з кожным членам партыі ў асобку, сакратары парткомаў асноўную работу пераклалі на цэхавых парторгаў, часамі нявопытных і непадрыхтаваных членаў партыі, а самі ўхіліліся ад непасрэдной работы і сувязі з кожным комуністам. Гэта прывяло і да таго, што дзве трэці партсходаў праводзяцца ў цэхах і групах за кошт скарачэння агульных партыйных сходаў. Калі мы павінны канстатаваць нізкі ідэйны узровень агульных партыйных сходаў, то што ўжо гаварыць аб цэхавых і групавых партыйных сходах, якія ў большасці праходзяць без усякай падрыхтоўкі.

Тут большая віна гаркома і горрайкомаў, якія своечасова не папярэдзілі гэтыя факты парушэння партыйнага статута. Зусім правільна на пленуме гаркома была прынята пастанова аб ліквідацыі цэхавых партгруп у тых партарганізацыях, дзе яны не прадугледжаны статутам партыі.

Другое пытанне — аб справаздачнасці і выбарнасці парткомаў. У статуце партыі ясна сказана, што партыйны камітэт абіраецца тэрмінам на адзін год. Ёсць таксама канкрэтныя дырэктывы партыі аб перыядычнай справаздачнасці парткомаў аб сваёй рабоце на агульных партыйных сходах. І ў гэтым пытанні мы маем ва многіх партарганізацыях грубейшае парушэнне статута партыі. Замест таго, каб пасля выходжання тэрміна паўнамоцтваў адчытацца на агульным партыйным сходзе і зрабіць перавыбары, многія парткомы пайшлі па лініі паступовых давыбараў членаў парткомаў (замест выбыўшых).

Парткомы фабрыкі «Комунарка», завода імя Варашылава, завода «Большэвік», Акадэміі навук і рад іншых па працягу года ні разу не адчываліся аб сваёй рабоце.

Трэба прама сказаць, што такое становішча партыйнай работы ні ў якім разе недапушчальна для Менскай партарганізацыі.

Асабліва гэта недапушчальна, калі мы да канца ўлічым палітычныя ўрокі, якія выцякаюць з вынікаў працэса над контррэволюцыйным трацкісцкім паралельным цэнтрам. Матэрыялы працэса з усёй паўнатой паказваюць, што там, дзе ўзровень партыйнай работы нізкі, там, дзе ўнутрыпартыйная работа знаходзіцца ў загоне, там, дзе партыйная арганізацыя захапляецца гаспадарчымі пытаннямі, забываючы аб сваёй асноўнай задачы — быць палітычным кіраўніком і арганізатарам мас — там ворагі знаходзяць больш выгадную глебу для сваёй контррэволюцыйнай работы. Гэта неабходна памятаць кожнаму комуністу, кожнай партыйнай арганізацыі. Гэта патрабуе рашучай перабудовы ўсёй работы пярвічных партыйных арганізацый, горрайкомаў і гаркома партыі. Пытанні партыйнай работы павінны з'яўляцца асноўным зместам дзейнасці пярвічных партарганізацый. Гэтым зместам павінны быць напоўнены і работа парткомаў і партыйныя сходы. Гэтым зместам павінна быць прасякнута работа горрайкомаў і гаркома партыі.

ПУШКІНСКІ ЗАПАВЕДНІК

У пачатку 1917 года, у хуткім часе пасля таго, як было скінута самадзяржаўе, сход сялян Баранецкай воласці, Пскоўскай губерні прыняў рэзалюцыю, якая ярка выражае любоў народу да геніяльнага рускага паэта А. С. Пушкіна. У ёй запісана: «Прасіць совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў зрабіць распараджэнне ўзяць сяло Міхайлаўскае з рук пскоўскага дваранства і перадаць яго ў агульнае дзяржаўнае ведание».

Вялікая социялістычная рэволюцыя ператварыла сяло Міхайлаўскае і вакольныя месцы, звязаныя з імем А. С. Пушкіна, у Дзяржаўны Пушкінскі запаведнік, які знаходзіцца зараз у веданіі Акадэміі навук СССР. Совецкая ўлада клапаціва ахоўвае той «куток зямлі», дзе Пушкін бліжэй і больш за ўсё далучыўся да багацціяў жывой народнай мовы, народнай мысці і народных паданняў, дзе Пушкін адбываў двухгадовую ссылку, напісаў некалькі бліскучых глаў «Евгения Онегина», стварыў «Графа Нулина» і «Бориса Годунова», дзе пакоіцца заўчасна загінуўшы вялікі рускі паэт.

Гэтыя любімыя паэтам месцы, дзе ён жыў і тварыў, праўдзіва і цёпла паказаны мастаком Л. С. Хіжынскім у сваіх акварэлях, якія ўвайшлі ў альбом «Пушкинский заповедник», выпушчаны Дзяржаўным выдавецтвам выяўленчых мастацтваў да стагоддзя са дня смерці А. С. Пушкіна. Сярод 20 работ Хіжынскага, уключаных у альбом, знаходзім «Михайловское», «Парк», «Домик няни», «Тригорское», «Скамью Онегина», «Могилу Пушкина», «Могильный холм», «Пушкинские горы» і інш. Бліскуча выданы альбом дае яркае ўяўленне аб тых месцах, з якімі неразрыўна звязан значны перыяд творчасці Пушкіна.

(БЕЛТА).

Байцы-выдатнікі К-скай часці, якой камандуе т. Сурдуноў, вывучаюць творы А. С. Пушкіна. НА ЗДЫМКУ: лейтэнант т. Паўлік чытае байцам артыкул аб Пушкіне з журнала «Спутник агитатора». (БСФ).

Пушкін—любімы паэт народу

ПОПЫТ НА ТВОРЫ

Стагоддзе з дня смерці А. С. Пушкіна выклікала вялікі попыт на творы паэта. Кожны дзень у кніжныя магазіны Уравіцкага раёна прыходзіць калгасная моладзь, настаўнікі, раённыя работнікі і купляюць творы Пушкіна.

Пяцьсот кніжак: «Евгений Онегин», «Капитанская дочка», Верасаева «Жизнь Пушкина» прададзены за адну гадзіну. Усяго за гэтыя дні прададзена 2500 экземпляраў пушкінскіх кніг.

Я. ЭПШТЭЙН.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

У сувязі з 100-годдзем смерці А. С. Пушкіна асінавіцкая раённая бібліятэка арганізавала канферэнцыю чытачоў паэта. Прысутнічала больш 500 чалавек.

Удзельнікі канферэнцыі з захапленнем выслухалі змястоўны даклад настаўніцы Кузняцовай. Пасля даклада вучні дэкламавалі пушкінскія вершы.

У памяшканні, дзе праходзіла канферэнцыя, была арганізавана фотавітрына, якая адлюстроўвала жыццёвы шлях паэта.

СКЕРКОЎСКІ.

З ЛЮБОЎЮ І ЗАХАПЛЕННЕМ

З выключнай любоўю і захапленнем рыхтаваліся вучні 5 школы (Менск) да пушкінскіх дзён. У школе арганізавана мастацкая выстаўка. Тут багата прадстаўлены малюнкі герояў і сцэнак з твораў паэта, вышыўкі на палатне на тэму пушкінскіх казак. Прыгожая выстаўка—справа рук саміх дзяцей, іх уласная творчасць.

Багатая мастацкая самадзейнасць падрыхтавана вучнямі. Хор з 80 чалавек выконвае «Бесы», «Девицы-красавицы», «Зимний вечер», «Узник». 30 вучняў 5 класа ставяць інсцэніроўку «Цыганы», вучні старэйшых класаў падрыхтавалі ўрыўкі з оперы «Пиковая дама», асобныя сцэнкі з «Бориса Годунова», шмат музычных нумароў, дэкламацый і танцаў.

Малодшыя класы скончылі падрыхтоўку да бала-маскарада па пушкінскіх казках.

— Мы любім казкі Пушкіна,—гаворыць вучні 2 класа «Б».

У школе праводзяцца зборы піонерскіх атрадаў, прысвечаныя стагоддзю з дня смерці Пушкіна, з гутаркамі саміх рэбят пра творчасць паэта. Рэбяты прыходзяць на зборы ў касцюмах пушкінскіх герояў. Некалькі лекцый прачытана супрацоўнікамі Акадэміі навук, якая шэфствуе над школай. Большасць вучняў калектыўна праглядала ўсе кінокарціны з жыцця паэта і на тэмы яго твораў.

Усё гэта яшчэ больш паглыбляе веды вучняў, прывівае любоў да прыгожага, вучыць лепш чытаць і разбірацца ў творах вялікіх класікаў.

Н. РУБІНШТЭЙН—старшы вожаты 5 школы імя Дабралюбава.

ЛЮБІМЫ ПАЭТ СОВЕЦКІХ ШКОЛЬНІКАЎ

Няма такой школы, якая-б не адзначыла 100-гадовы юбілей смерці Пушкіна. І гэта зусім натуральна, бо Пушкін стаў самым любімым паэтам совецкіх школьнікаў.

Крычаўская сярэдняя школа арганізавала пушкінскі вечар. На ім апрача вучняў прысутнічалі дарослыя рабочыя і калгаснікі. Сіламі драмгуртка была паказана інсцэніроўка «Цыганы» і ўрывак з трагедыі «Борис Годунов». Вучні 10 класа дэкламавалі вершы Пушкіна.

Вера ЛІЎШЫЦ.

У ВАЙСКОВАЙ ЧАСЦІ

Разам з усёй краінай, з усёй Чырвонай Арміяй адзначае незабыўную памяць вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна і часць, якой камандуе тав. Смолкін.

У дзень стагодавага юбілею смерці паэта ў часці дзе арганізаван вялікі літаратурны вечар. У праграме вечара даклад аб жыццёвым шляху і літаратурнай дзейнасці паэта, дэкламацыя яго вершаў, выкананне музычных твораў.

У заключэнне вечара байцы ўбачаць урывак з трагедыі «Барыс Гадуноў». Жонка камандзіра Смолкіна пашыла спецыяльныя касцюмы для герояў Пушкіна.

Чырвонаармеец С. ЖУРАЎЛЁЎ.

ПЕСНЯ ПРА ВЯЛІКАГА ПАЭТА

А. С. Пушкін стаў любімым паэтам калгаснай вёскі. Калгаснікі з захапленнем чытаюць яго творы, складаюць і спяваюць пра яго свае песні.

Вось што спяваюць калгаснікі арцелі імя Валковіча, Туркаўскага сельсовета, Бабруйскага раёна:

«На вуліцы снег ідзе,
Гурбы намятае.
А я паэмы Пушкіна
Кожны дзень чытаю.
Мой мілёнак на граніцы,
Спержаж спакой яе,
А я дома не скучаю
Кніжкі Пушкіна чытаю».

Частушкі запісалі: І. КАПУСЦІН, А. АЎЧЫННІКАЎ.

ПУШКІНСКІ ВЕЧАР ДЛЯ ПАРТАКТЫВА

Для партыйнага актыва сталіцы БССР 9 студзеня быў наладжан вечар, прысвечаны стагадоваму юбілею са дня трагічнай гібелі вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна. Вечар адбыўся ў менскім Доме партактыва. З вялікай увагай сабрыўшыяся праслухалі даклад прафесара Бранштэйна аб жыцці і творчасці Александра Сергеевіча Пушкіна.

У заключэнне вечара ленінградскі дзяржаўны тэатр «Живая книга» даў пастаноўку «Дубровский». На сцэне залы пры нескладанай дэкарацыі два артысты тэатра з вялікім майстэрствам і выразнасцю чыталі аповесць паэта. Асобныя месцы гэтай аповесці ўдала імі разыгрываліся, суправаджаліся сімфанічным трыо, ігрой на баяне і светавымі эфектамі. Пасля пастаноўкі ў глядачоў засталося незгладжальнае ўражанне аб адным з прагаічных твораў вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна.

У СЯЛЕ КАМЕНКА

КІЕЎ. (БЕЛТА). Рэдакцыя «Апошніх паведамленняў» украінскага радыёкамітэта 8 лютага арганізавала перадачу з сяла Каменкі, прысвечаную пушкінскай гадавіне. Перад мікрафонам выступіў калгаснік сельгасарцелі «Окцябр», Каменскага раёна, тав. Краўчанка.

— Я ведаю пра Пушкіна не толькі з кніг,—сказаў ён. Мне ўрэзаліся ў памяць успаміны майго дзеда—былога прыгоннага Давыдавых—аб вялікім паэце. Цяпер мне 52 гады. Калі я быў хлапчуком, дзед, абучаючы мяне грамаце, расказваў пра ветлівага госця, які наведваў Давыдавых. Потым я даведаўся, што малады госць, пра якога расказваў мне дзед, быў вялікі рускі паэт. Гэта ён навучыў майго дзеда грамаце.

— Я вельмі люблю і часта чытаю творы Пушкіна,—гаворыць далей тав. Краўчанка.—Я ганаруся тым, што жыву ў сяле, дзе жыў і тварыў геніяльны паэт.

***

Працоўныя Каменкі шануюць памяць вялікага паэта. Усе гістарычныя помнікі, звязаныя з прабываннем у Каменцы А. С. Пушкіна, адноўлены. Будуць пабудаваны гаспіталь імя экскурсантаў і клуб імя Пушкіна. У доме, дзе жыў і тварыў паэт, будзе музей і бібліятэка.

АЛІМПІЯДА ШКОЛ СТАЛІНСКАГА РАЁНА

Цікава і ярка прайшла пушкінская алімпіяда мастацкай самадзейнасці школ Сталінскага раёна Менска. Два вечары 7 і 8 лютага дзеці, запоўніўшыя прасторную залу Палаца піонераў і акцябрат імя Н. Ф. Гікало, жылі ў свеце незабыўных захапляючых вобразаў і фарбаў твораў Пушкіна.

Самыя рознастайныя нумары былі паказаны на алімпіядзе.

Піонеры 33 школы інсцэніравалі казку «О мёртвой царевне». Бабулька за вязаннем расказвае казку, і на сцэне з'яўляюцца ў каляровых убраннях персанажы казкі. Жыва і прыгожа разгортваецца дзея. Юныя глядачы ў зале захоплены. Знаёмыя казачныя вобразы вырысоўваюцца перад імі ва ўсёй непередавальнай пуднаўнасці.

Удала выконвалі песні хоры вучняў малодшых класаў 5 і 2 школ. Мастацкае чытанне вершаў, інсцэніроўкі па творах «Дубровский», «Цыганы», «Полтава», урыўкі з опер «Евгений Онегин», «Пиковая дама», сцэнкі з «Бориса Годунова», музычныя нумары і танцы—такія формы мастацкай самадзейнасці паказалі школы, як вынік падрыхтоўкі да пушкінскіх дзён.

У творах вялікага паэта дзеці знаходзяць багаты матэрыял для развіцця сваіх мастацкіх густаў, сваіх здольнасцей.

ПІСЬМЫ З БІРАБІДЖАНА

Азет-арганізацыі, прадпрыемствы і школы рэспублікі атрымліваюць пісьмы з Біраблджана ад перасяленцаў працоўных яўрэяў. У іх расказваецца аб росце Яўрэйскай аўтаномнай вобласці, аб радасным і шчаслівым жыцці працоўных розных нацыянальнасцей у адроджаным краі. Столяр біраблджанскай мэблевай фабрыкі імя Дзімітрава тав. Г. А. Ліўшыц у сваім пісьме ў гомельскі Азет піша:

«Я не ведаю, як і чым адказаць совецкую ўладу і комуністычную партыю за тое, што мяне паслалі ў Яўрэйскую аўтаномную вобласць, дзе жыццё радаснае і шчаслівае, дзе на кожным кроку адчуваеш клапатлівую руку совецкага ўрада і таварыша Сталіна. У Біраблджане шмат розных нацыянальнасцей, але ўсе прасякнуты пачуццём дружбы і салідарнасці. Радуецца сэрца, калі бачыш агульны ўдзел усіх у социялістычным будаўніцтве вобласці.

На нашай фабрыцы працуе шмат яўрэяў, якія прыехалі з Польшчы, Латвіі, Літвы і Амерыкі. Адзін столяр, што прыехаў з Амерыкі, расказаў мне, што ён там быў беспрацоўным і начаваў на вуліцы. Другі столяр Шкляровіч прыехаў з Аргенціны, дзе ён працаваў у яўрэйскага фабрыканта. Ён гаворыць, што ніколі не забудзе як яго фабрыкант эксплаатаваў».

Тав. Ліўшыц перадае ў сваім пісьме словы ўсіх прыехаўшых з-за граніцы, што яны ў СССР знайшлі сваю сапраўдную радзіму. У працоўных вобласці разам з аддзанасцю да вялікай социялістычнай радзімы мацнее патрыятызм і любоў да сваёй нацыянальнай вобласці.

А вось і другое пісьмо з Біраблджана ад студэнтаў Біраблджанскага горнаметалургічнага тэхнікума. Яны пішуць у Рагачоў сваім таварышам па школе: «Мы вучымся ў адзіным у свеце яўрэйскім горнаметалургічным тэхнікуме. Усе мы, прыехаўшыя з Рагачова, вучымся на адным курсе, вучымся добра, актыўна ўдзельнічаем у грамадскім жыцці».

Студэнты ў сваім пісьме расказваюць аб сваім радасным жыцці і запэўніваюць сваіх таварышоў, што будуць выхоўваць з сябе высокакваліфікаваных будаўнікоў цяжкай індустрыі Яўрэйскай аўтаномнай вобласці.

Нядаўна ў «Комсомольской правде» было апублікавана пісьмо польскага беспрацоўнага яўрэя-пекара, які пісаў у Азет, што ён згодзен на ўсякую работу і просіць каб яму прадаставілі магчымасць прыехаць у Біраблджан: «Біраблджан — гэта наша надзея» — пісаў гэты беспрацоўны. Недарма такая вялікая цяга працоўных яўрэяў капіталістычных краін у СССР, у Біраблджан.

Н. ГАСМАН.

КАЛГАСНІКІ БССР ЕДУЦЬ НА СЕСІЮ АКАДЭМІІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ НАВУК імя ЛЕНІНА

13 лютага Усесаюзная Акадэмія сельскагаспадарчых навук імя Леніна склікае сесію плодагародняй секцыі, прысвечаную пытанням узняцця ўраджайнасці бульбы. У рабоце сесіі прыме ўдзел дэлегацыя БССР з 11 чалавек, у тым ліку 5 калгаснікаў-стаханаўцаў Барысаўскага і іншых раёнаў рэспублікі. Дырэктар інстытута біялогіі Акадэміі навук БССР праф. Дарожкін зробіць на сесіі даклад на тэму: «Агратэхніка атрымання высокіх ўраджаяў бульбы ў БССР».

ПАЕЗДКА НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ У КАЛГАСЫ

Інстытут аграглебазнаўства Акадэміі навук БССР накіроўвае 20 навуковых работнікаў у раёны і калгасы БССР для дапамогі ў надрыхтоўцы да веснавой сяўбы і барацьбе за атрыманне высокіх ураджаяў. 7 работнікаў ужо выехалі на месцы. Усе вылучаныя работнікі прымаюцца да раёнаў на ўвесь перыяд веснавой сяўбы. Будзе абслужана 10 раёнаў—Чавускі, Полацкі, Менскі, Пухавіцкі, Мазырскі і інш. Да веснавой сяўбы інстытут аграглебазнаўства выпускае чатыры брашуры па пытаннях агратэхнікі высокіх ураджаяў.

ШТО НОВАГА НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ

Пашырэнне вытворчасці поўвала. На скурзаводзе імя Еўсцігнеева ў Віцебску будуецца новы цэх па выпрацоўцы поўвала магутнасцю ў 560 тон прадукцыі ў год. Да пачатку 1938 года цэх уступіць у эксплаатацыю. Кошт будаўніцтва — каля 500.000 рублёў.

Лакіровачны цэх на заводзе «Большэвік». У Менску на гарбарні «Большэвік» заканчваецца абсталяванне лакіровачнага цэха. У канцы першага квартала ў цэху пачнецца вопытная работа па выпрацоўцы лакіраванай скуры. У лабараторным парадку вытворчасць такой скуры ўжо асвоена.

ЗДАРЭННІ

* **Смерць ад чаду.** Гр-н Шыменкоў В. А., 62 год. які пражывае ў вёсцы Гніліца, Гніліцкага сельсовета, Чырвонапольскага раёна, затапіў бляшаную печку дубовымі дровамі. Не даўшы як належыць прагарэць вугалям, ён закрыў трубу, і сям'я ўляглася спаць. Назаўтра суседзі знайшлі Шыменкова, яго жонку Матрону і сына Андрэя мёртвымі.

КОРАТКА

* Прэзідыум Акадэміі навук БССР абвясціў конкурс на лепшую навукова-даследчую работу, выкананую работнікамі Акадэміі ў 1936 годзе. Вызначана 4 прэміі: у 5 тыс. руб., 3 тыс. руб., 2 тыс. руб. і 1 тыс. руб.

* У калгасе «Трэці рашаючы» Семляжоўскага сельсовета, Чырвонаслабодскага раёна шырока разгорнута мастацкая самадзейнасць. Добра працуюць драматычны і харавы гурткі. Зараз калгас арганізоўвае духавы аркестр. Закуплены музычныя інструменты на 4.500 руб.

СКУЦЭНЯ.

* У калгасе «Краіна Совета ў» Голацкага сельсовета, Смілавіцкага раёна арганізавана арцель па пашыўцы і рамонту абутку. У арцелі працуюць 4 калгаснікі-шаўцы. Пашыўка і рамонт абутку праводзіцца хутка і добраякасна.

С. ДЗЯТКО.

Ад Варашылаўскага РК КП(б)Б

Згубленыя і ўкрадзеныя партбілеты ўзору 1936 года, выданыя Варашылаўскім РК КП(б)Б гор. Менска на імя Бударына Канстанціна Іванавіча за № 0857930, Капылёвай Гені Абрамаўны за № 0873337, Фінкель Міхлі Іцкаўны за № 0857983, кандыдацкія карткі, выданыя на імя Гершковіч Рывекі Маісееўны за № 0548340 і Скаценка Мітрафана Васільевіча за № 0548109, — лічыць несапраўднымі.

Сакратар Варашылаўскага РК КП(б)Б КАВАЛЁЎ.

ДЗЕННІК

Вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня смерці А. С. Пушкіна, адбудзецца 13 лютага, у 7 гадз. 30 мін. вечара, у памяшканні Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатра. Білеты атрымаць у райкоме. Праграма вечара — «Жыццё і творчасць Пушкіна»—даклад праф. Бранштэйна. 2. Канцэрт.

Кагановіцкі горрайком КП(б)Б.
Кагановіцкі горрайком ЛКСМБ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЁННЯ, 11 ЛЮТАГА ў ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ТЭХНІКІ
адбудзецца
ДАКЛАД
вядомага вынаходца, інжынера-электрыка
ФРЫДКІНА П. А.
на тэму
„НОВЫ ЭЛЕКТРАПРЫВОД“.
Пачатак лекцыі роўна ў 7 гадзін вечара.
На лекцыю запрашаюцца: члены ІТР, гаспадарнікі, вынаходцы, рабочыя-стаханаўцы, выкладчыкі ВТНУ, працаўнікі НДІ прамысловасці, Акадэміі навук.
Назначаная на 11 лютага лекцыя прафесара Б. І. ТРУСЕВІЧА на тэму: „ХАРЧАВАННЕ ЧАЛАВЕКА“ ПЕРАНОСІЦЦА на 1 САКАВІКА
ў 7 гадзін вечара. Абанементы сапраўдны.

ГАТУНКОВАЕ НАСЕННЕ
ТРАЎ КАНЮШЫНЫ, КОРАНЬПЛОДАЎ, ГАРОДНЫХ КУЛЬТУР і КВЕТАК
ПРАДАЕЦЦА з ЛАРКОЎ, СКЛАДАЎ і БАЗ
ДЗЯРЖСОРТФОНДА
У МЕНСКУ (НА РЫНКАХ — КРЫТЫМ, ЧЭРВЕНЬСКІМ і ПЛЯЦЫ 25 КАСТРЫЧНІКА). У ТАЛАЧЫНЕ, ОРШЫ, ПОЛАЦКУ, НЕГАРЭЛЫМ, РУДЗЕНСКУ, ПУХАВІЧАХ, БАБРУЙСКУ, СЛУЦКУ, КОПЫЛІ, РАГАЧОВЕ, МАГІЛЕВЕ, БЯЛЫНІЧАХ, ГОМЕЛІ, ВЕТКІ, ПЕРАХОЎЦЫ, ВІЦЕБСКУ і КАЛІНКАВІЧАХ.
ПРОДАЖ НАСЕННЯ ПРАВОДЗІЦЦА ЎСІМ ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ ЦЭНАХ.
ЦЭНЫ НА НАСЕННЕ ПАВЕДАМЛЯЮЦЦА БЯСПЛАТНА ПА ПЕРШАМУ ПАТРАБАВАННЮ
па адрасу: г. Менск, рог Энгельса і Комуністычная, 18/11, Белканторы Дзяржсортфонда
тэл. 23-681, 22-364)
БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖСОРТФОНДА.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО
БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
11 лютага
СПЕКТАКЛЯ НЯМА
ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
11 лютага бяз. 68
ЗАКАТ
Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка»
ДУБРОЎСКІ
Дзіцячы гукавы кінатэатр
ФЕДЗЬКА
Гукавы кінатэатр «Пролетарый»
ФЕДЗЬКА
Гукавы кінатэатр «Спартак»
ДА ПАДЗЕЙ У ІСПАНІІ
з 1 па 12 выпуск — 12 выпускаў у адзін сеанс.

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
АД 11 ЛЮТАГА
да пушкінскіх дзён
дэманструецца гістарычны мастацкі фільм
ПАЭТ і ЦАР

МЕНСКАМУ САЮЗУНІВЕРМАГУ НКУГ БССР
ПАТРЭБНЫ прадаўцы
ПА КУЛЬТТАВАРАХ, ЦАЦКАХ І ТРЫКАТАЖУ, ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ І АХРАННІКІ.
Зварачацца ў аддзел кадраў Саюзунівермага — Совецкая, 59 з 10 да 12 гадзін раніцы.
ДЫРЭКЦЫЯ.

НКЮ БССР
ЮРЫДЫЧНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
Прадаўжаецца ПАДПІСКА — на 1937 год —
КОГІЗ
на ЗБОРНІК ЗАКОНАЎ і РАСПАРАДЖЭННЯЎ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА ЎРАДА САЮЗА ССР
(па беларускай мове)
ПЕРШЫ АДДЗЕЛ
У зборніку законаў і распараджэнняў апублікоўваюцца пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР, ЦВК і СНК Саюза ССР і СПА.
Зборнік выходзіць па меры паступлення законадаўчых матэрыялаў з дадаткам па скончэнню года — алфавітнага ўказальніка.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 6 мес. — 5 руб. на 12 мес. — 10 руб.
Падпіска прымаецца аддзяленнямі, кніжнымі магазінамі, кіёскамі, упаўнаважанымі КОГІЗ'а, Саюздрукам і ўсюды на пошце.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ГРАМАДЗЯН г. МЕНСКА, ШТО З 1 ЛЮТАГА г. г. АРГАНІЗАВАНА
БЮРО АБСЛУГОЎВАННЯ СПАЖЫЎЦОЎ ЭЛЕТРАЭНЕРГІІ „БАС“
БЮРО ВЫКОНВАЕ НАСТУПНЫЯ РАБОТЫ:
1. ВЫПРАЎЛЕННЕ ЎНУТРАНЫХ І ЗНАДВОРНЫХ ПАШКОДЖАННЯЎ ЭЛЕКТРАПРАВОДАК.
2. УСТАНОЎКА І ЗНЯЦЦЕ ШЧОТЧЫКАЎ.
3. УСТАНОЎКА КАНТРОЛЬНЫХ ШЧОТЧЫКАЎ.
4. СКЛАДАННЕ КАШТАРЫСАЎ НА ЎВОДЫ, ЎНУТРАНЫЯ ПРАВОДКІ І ВЫКАНАННЕ ГЭТЫХ РАБОТ.
3. РАМОНТ ЗНАДВОРНЫХ ЎВОДАЎ І ЎНУТРАНЫХ ПРАВОДАК (ЗАМЕНА ПРАВАДОЎ і т. д.).
ЗАЯЎКІ прымаюцца штодзённа, уключаючы і выходныя дні, з 8 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы асабіста і па тэлефонах №№ 20-691 і 20-765.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.
У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Менская станцыя абслугоўвання
„САЮЗАУТАРАМОНТ“
даводзіць да ведама ўсіх аўтагаспадарак гор. Менска і раёна,
ШТО Ў СУВЯЗІ З ПЕРАХОДАМ НА НОВЫ ВІД РАБОТ, станцыя з 1 лютага 1937 г. прыступіла
да перазаключэння і заключэння ДАГАВАРОЎ
на рамонт аўтамашын марак ГАЗ „А“ і „АА“ і М-1 на:
1) ПОЎНАЕ ГАДАВОЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ПЛАНАВА-ПАПЕРАДЖАЛЬНЫМ РАМОНТАМ З ГАРАНТЫЯЙ МІЖРАМОНТНАГА ПРАБЕГУ;
2) ПРАФІЛАКТЫЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ І ЗАЯВАЧНЫЯ РАБОТЫ ПА ЎКАЗАННЮ КЛІЕНТА.
Каштоўнасць рамонту ў параўнанні з 1936 г. ЗНІЖАНА НА 25 ПРОЦ.
Апрача таго прымаюцца ў недагавары машыны ГАЗ, М-1 і ЗіС на чыстую прафілактыку і мойку.
ЗА ЎСІМІ ДАВЕДКАМІ ЗВАРАЧАЦЦА —г. Менск, Магілеўскае шасе, 6, Тэл. 25-158.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Завочны сектар Менскага педінстытута
просіць усіх, скончыўшых завочны сектар Менпедінстытута і не абараніўшых дыпломную работу,
ПАВЕДАМІЦЬ свае адрасы
з мэтай выклікі ў чэрвені месяцы 1937 г. для дзяржаўных экзаменаў.
АДРАС: Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, завочны сектар Менскага педінстытута.
ЗАВОЧНЫ СЕКТАР.

Уп. Галоўлітбела № К—563. Друкарня газеты «Звязда» Менск Совецкая 63. К. Б. С.